В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

## 3

Частка 1




Спампавана з сайта www.aversev.by

В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

УДК 811.161.3(075.2=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
С24

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. В. Вернікоўская*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 131 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце *Т. В. Шантур*)

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

**Завяжы вузялок!** — важная інфармацыя;

 — дадатковае творчае заданне, якое выконваецца па жаданні;

 — слоўнік;

**?!** — праблемнае пытанне;

**Рм** — заданне па развіцці маўлення;

 — дамашняе заданне;

 — выкананне задання ў электронным дапаможніку.

ISBN 978-985-559-882-5 (ч. 1)
ISBN 978-985-559-881-8

© Свірыдзенка В. І., 2017
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

# ПАЎТАРЭННЕ

**Успомніце**

Якія бываюць гукі мовы? Як гукі перадаюцца на пісьме? Выкарыстайце схемы.

Гукі мовы

[а], [о] — ?

к[о́]шк[а]

[в], [ж], [ш] — ?

[в]оз, [в’]ёз

[ж]ар, [ш]ар

[а] → ***а, я***

*гук* ?

Назавіце ўсе літары беларускай мовы ў алфавітным парадку.

**1.** Прачытайце верш. Якая важная падзея ў жыцці вучняў адбываецца восенню?




Восень дзяцей сустракае.
— Дзень добры! — вітае здалёк. —
Гатовы да школы? — пытае.
— Гатовы! Чакаем званок.

*Н. Галіноўская.*

Назавіце словы ў вершы, у якіх літар больш, чым гукаў. Спішыце. Падкрэсліце словы з двух складоў.

**РМ** Раскажыце, як вы рыхтуецеся да Дня ведаў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**2.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце іх. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

Мяне завуць ... ... . Я вучуся ў трэцім класе. Наша школа знаходзіцца ў *(горадзе/вёсцы)* ... . Маю настаўніцу завуць ... ... .

Назавіце галосныя гукі ў словах другога сказа.

**3.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку. Пастаўце ў ім націск. Падкрэсліце ў слове літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.




Дом-палац стаіць высокі.
Нашых ведаў там вытокі.
Радасць свеціцца наўкола.
Ну вядома, гэта ... .

*У. Мазго.*



***выто́кі*** — тут: *пачатак*
***наўко́ла*** — *навокал*

Выпішыце з загадкі словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Назавіце гукі, якімі адрозніваюцца словы. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**4.** Расстаўце словы ў алфавітным парадку і запішыце прыказкі. Чаму так гавораць?

1) заўсёды, вучы́цца, згадзіцца; 2) не, вучыць, спяшайся, іншых.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**5.** Прачытайце лічылку.

Золкім ранкам па расе
выйшла сонца да вады.
Пахаваліся мы ўсе,
а шукаць нас будзеш ты.
*А. Зэкаў.*

Назавіце і запішыце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.



***зо́лкі** — сыры і халодны*



Вывучыце лічылку. Выкарыстайце яе ў гульні з сябрамі на перапынку ў школе.



**6.** Прачытайце і адгадайце загадку. Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары.

Горы, акіяны,
лес намаляваны.
(***О***/*о*)мск, (*М*/*м*)аскву і (*М*/*м*)інск,
(***Б***/*б*)арнаул і (*П*/*п*)інск —
усё знойдзеш сам.
Сябры жывуць там.
*У. Мацвеенка.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Запішыце слова-адгадку, абазначце ў ім націск. Падкрэсліце словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**7.** Параўнайце пару слоў. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне.

каралí — кара́лі

**?!** Чаму трэба правільна ставіць націск у словах? Пазнаёмцеся са значэннем яшчэ аднаго слова — *кара́лі*.

Каралі, або па́церкі, — дробныя ўпрыгожванні з каштоўных камянёў, буршты́ну, шкла, дрэва. Іх нанізваюць на нітку ці тонкі шнурок і носяць на шыі і на грудзях. Часам не адну, а некалькі ні́зак — і тады каралі ззяюць-пераліваюцца, як вясёлка *(М. Маляўка)*.

***буршты́н*** *— янтар*

***ні́зка*** *— нанізаныя на нітку аднолькавыя прадметы*

Спішыце першы сказ. Абазначце націск у словах.

## Успомніце

Калі пішуцца літары ***о, э—а*** ў словах? Калі пішуцца літары ***е, ё—я*** ў словах?

Выкарыстайце схемы.

**во́**чы → **ва**ня́ты    **дрэ́**ва → **драў**ля́ны

**цё́**плы → (1) **цяп**|ло́ → (2) **цеп**|(1) ла|ва́ты

(2) пе|(1) ра|**ле́**сак → (1) **ляс**|ні́к



Спампавана з сайта www.aversev.by

**8.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

К..зачка купіла к..зляняткам к..шык капусты *(У. Мацвеенка)*.

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

**9.** Паслухайце верш. Які малюнак асенняй прыроды створаны ў ім? Якія словы дапамаглі ўявіць восень падобнай на дзяўчыну? Пра якія пацеркі гаворыцца ў вершы?

## Восень

Восень пац*(я/е)*ркі рассыпала на мох.
Іх нізаць жураўка **дапамог.**
Везла восень пэндзлікі на **возе.**
Малявала лісце на б*(е/я)*розе.
На ручай пускаў лістоту клёнік,
кожны лісцік — кал*(я/е)*ровы чоўнік.

*Д. Бічэль.*



Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Змяніце выдзеленыя словы так, каб замест ***о*** трэба было пісаць ***а***.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**10.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.




**В..сной в..сялі́ць, улетку халадзі́ць, ув..сень корміць, узімку сагр..ва́е.**

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.



**11.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

**Што ў л..се родзіцца, у с..ле́ згодзіцца. С..ння зробіш — заўтра як зн..йдзеш. Р..шатам в..ды не наносіш. Меней г..вары, болей р..бі́.**

Спішыце, устаўце патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

**Успомніце**

Чым адрозніваюцца гукі [ў] і [у]? Калі пішацца літара ***ў***?

Выкарыстайце схему.

літара ***ў*** →
- пішацца пасля галосных
- не пішацца пасля знакаў прыпынку
- ! не бывае вялікай



Спампавана з сайта www.aversev.by

**12.** Прачытайце тэкст. Чаму трэба быць уважлівымі да сваіх матуль? Як трэба праяўляць сваю любоў да іх?

Мама — самы блізкі чалавек для сваіх дзяцей. Яна за*(у/ў)*сёды клапоціцца пра іх. Маму ласка́ва называюць сонейкам, ласта*(у/ў)*кай, светлай зара́начкай. Ёй прысвячаюць вершы і песні.

**Часцей *(у/ў)*сміхайцеся матулі! За*(у/ў)*сёды дапамагайце ёй. Віншуйце яе *(у/ў)* свя́ты.**

***зара́нка, зара́начка** — ранішняя зара*

Растлумачце правапіс літар ***у, ў***. Спішыце выдзеленыя сказы, устаўляючы патрэбныя літары.

**Рм** Якое свята адзначаецца 14 кастрычніка? Як вы павіншуеце матулю ў гэты дзень?

**13.** Прачытайце верш. Чаму ён мае такую назву?

## Памочніца

Пацалую маму *(у/ў)* шчочк*(у/ў)*.
Вазьму венік *(у/ў)* куточ*(у/ў)*,
падм*(е/я)*ту падлог*(у/ў)* чыста.
Пасц*(е/я)*лю абрус кв*(е/я)*цісты,
прын*(е/я)*су піражных з крамы —
сёння свята *(у/ў)* маёй мамы.

*Г. Нічыпаровіч.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**14.** Прачытайце і растлумачце прыказку.

**Шануй бацько*ў*: другіх не знойдзеш.**

Спішыце, падзяляючы словы на склады. Растлумачце правапіс выдзеленай літары ў слове.

**15.** Прачытайце сказы. Якія літары (***у*** або ***ў***) трэба ўставіць? Запішыце адзін сказ на выбар.

1. Прыгожую пашто..ку зрабіла для матулі ..льянка. 2. Сяргейка вывучы.. песню на словы ..ладзіміра Іванавіча Карызны. 3. Гарадскі пасёлак ..ша́чы пабудаваны на беразе ракі ..ша́чы.



**16.** Прачытайце верш. Якое пачуццё да матулі перадаецца ў ім?

Сонца парой залатою  
будзіць *(у/ў)* росных гаях,  
жа*(у/ў)*ранкаў просіць  
сп*(е/я)*ваць над з*(е/я)*млёю  
мама мая.  
З ёй весялейшыя песні,  
радасць мілей удвая!  
Самая, самая лепшая *(у/ў)* свеце  
мама мая.

*У. Карызна.*

Спішыце першы і апошні сказы верша. Устаўце ў словы патрэбныя літары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Успомніце

Якімі літарамі абазначаюцца на пісьме гукі [дз’], [ц’]? Як абазначаецца на пісьме мяккасць зычных гукаў?

Выкарыстайце схему.




**17.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна іх вымаўляць.

Дзятлы дзюбамі дзяўблі дрэва. У цемры цецераня́ткі цікуюць татку.

 ***цікава́ць*** — *выглядваць*; рус. *высматривать*

Запішыце скорагаворкі па памяці. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі і галосныя пасля іх.

**18.** Прачытайце, дапаўняючы сказы патрэбнымі словамі.

 хадзілі ў лес. Там яны бачылі  . У птушкі доўгая  . Ёй  здабывае ежу.

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***дз, ц***.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**19.** Прачытайце рускія словы. Перакладзіце іх на беларускую мову.

День, дядя, дед, тень, тётя, кустик, Тимофей, Катя, ветер.

Запішыце беларускія словы. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***дз, ц***. З двума словамі на выбар складзіце і запішыце сказы.

**20.** Прачытайце. Вымаўляйце на месцы пропускаў гукі [ц’] або [дз’]. Чаму верш мае такую назву?

### Вожык-возчык

Едзе, едзе лісця воз  
паміж клёнаў і бяроз.  
**Ліс..е** жоўтае на возе.  
Гэй, не **стой..е** на дарозе!  
Воз клубочкам **пака..іўся** —  
ліст ніводзін не зваліўся.  
Падчапіў ён новыя  
два лісты кляновыя.  
**Е..е**, едзе **..іўны** воз  
паміж клёнаў і бяроз.

*Н. Галіноўская.*

Выпішыце з верша выдзеленыя словы, устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Успомніце

Якія зычныя гукі называюцца няпарнымі цвёрдымі (зацвярдзелымі)? Як яны перадаюцца на пісьме?

Выкарыстайце схему.




**21.** Прачытайце загадку. Пра якія грабяні ў ёй гаворыцца?



**Што вы скажаце пра грэбень?**

Гр..бень шмат каму патрэбен:  
і расчэсваць валасы,  
і жывёле для красы,  
і прываблівым жанч..нам,  
і завоблачным вярш..нам,  
бурнай пеністай вадзе  
і касматай барадзе.  
Словам, дзе ні грабяні́,  
усюды трэба грабяні.

*К. Крапіва.*







Спішыце першы сказ, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце іх і растлумачце правапіс.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**22.** Да слоў з левага слупка падбярыце блізкія па значэнні словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| цеплыня | расч..ска |
| водгаласак | тавар..ш |
| сябар | гарач..ня |
| высь | р..ха |
| грэбень | выш..ня |

Запішыце словы парамі, устаўляючы патрэбныя літары. З двума словамі на выбар вусна складзіце сказы.



**23.** Прачытайце верш. Спішыце, устаўляючы ***дз*** або ***ц***.

Дзе хто хо..іць, дзе хто блу..іць,
дзе хто ёс..ь і дзе хто бу..е,
ці то блізка, ці далёка,
ведае пра ўсё сарока.
Бо яе даўжэзны хвост
чуе ўсё за многа вёрст.

*К. Камейша.*

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**Успомніце**

Якія зычныя гукі могуць падаўжацца паміж галоснымі? Як абазначаюцца падоўжаныя зычныя на пісьме?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Выкарыстайце схему.

[ж̄] — падаро ж ж а, [ш̄] — заці ш ш а,

[з̄’] — пало з з е, [с̄’] — кало с с е,

[л̄’] — га л л ё, [н̄’] — насе н н е,

[ц̄’] — бага ц ц е, [ч̄] — но ч ч у,

[д̄з̄’] — ла д дз я

**24.** Спішыце словы, устаўляючы патрэбныя літары.

Навока*(л/лл)* — навако*(л/лл)*е, ко*(с/сс)*ка — двуко*(с/сс)*е, карэ*(н/нн)*е — кора*(н/нн)*ь, бязме́*(ж/жж)*а — мя*(ж/жж)*а, рэ*(ч/чч)*ка — зарэ*(ч/чч)*а, мы*(ш/шш)* — мы*(ш/шш)*у, жы*(ц/цц)*ь — жы*(ц/цц)*ё, су*(д/дз)*іць — су*(дз/ддз)*я.

**25.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

На добрае пыта*(н/нн)*е добрае і апавяда*(н/нн)*е.

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя і галосныя пасля іх.



Спампавана з сайта www.aversev.by

### Успомніце

Калі ў словах пішуцца апостраф і раздзяляльны мяккі знак?

Выкарыстайце схему.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі | ’ | ё, е | і, я, ю |
| Літары **л, н, з, с, ц, дз,** якія абазначаюць мяккія зычныя гукі | ь | | |

**26.** Спішыце словы. Дапішыце ў іх патрэбную літару або знак.

1) Аб..ява, аб..езд, п..еса, аб..ём, інтэрв..ю, камп..ютар, бар..ер, вераб..і.

2) Міл..ён, міл..ярд, л..е, вал..ер, парц..еры, брыл..янт.

Па якой прымеце словы падзелены на дзве групы?

**27.** Прачытайце вершаваныя радкі. Што абазначае выдзелены выраз у іх?



Гэты рыжы, рыж.. рыж..к.
З..еш — і **пальч..кі абліжаш!**
*В. Зуёнак.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары або знак.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**28.** Прачытайце верш.



Шампін*(ь/’)*ён, шампін*(ь/’)*ён —
Ці падсмаж*(і/ы)*ць, ці ў булён.
У засто*(л/лл)*і кампан*(ь/’)*ён
І па смаку ч*(э/е)*мпіён!

*В. Зуёнак.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

**29.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Калі так гавораць?

| | |
|---|---|
| Гром б*(ь/’)*е, як з … . | *вядра* |
| Дождж л*(ь/’)*е як з … . | *гармáты* |

Запішыце, устаўляючы ў словы патрэбную літару або знак.

**30.** Прачытайце. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

1. Студзен**ь** мяце — ліпен**ь** зал**ье**. 2. Снегу навее — хлеба прыбудзе, в**а**да разал**ь**ецца — сена наб**я**рэцца.

Запішыце першы сказ па памяці. Падкрэсліце слова з раздзяляльным мяккім знакам.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**31.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

1. Тата, мама і дзеці — гэта … . 2. Упрыгожанне з каштоўных камянёў з падвескамі спераду — гэта … . 3. Паведамленне, якое даводзіцца ўсім да ведама, — гэта … . 4. Перагародка, якая ставіцца як перашкода, — гэта … .

Словы для даведкі: *сям..я, бар..ер, кал..е́, аб..ява.*

Запішыце сказы, устаўляючы ў словы патрэбную літару або знак.

Спампавана з сайта www.aversev.by

# ТЭКСТ

## Прыметы тэксту

**32.** Прачытайце дзве групы сказаў. Якая з іх з'яўляецца тэкстам?

1. Спадчына! Якое простае слова, і якi няпросты яго сэнс! Цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй. Памяць народа — гэта самае вялікае багацце, якое і называецца спадчынай *(Паводле В. Віткі)*.

2. Нарач — самае вялікае возера ў Беларусі. Турысты любаваліся лясным возерам. Паўночную частку Беларусі называюць краем блакітных азёр. Дзядуля расказаў унукам легенду пра возера Свіцязь.

Спішыце тэкст.

**Успомніце**

Што такое тэма тэксту?
Выкарыстайце схему на форзацы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**33.** Прачытайце назву верша. Разгледзьце малюнак да яго. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова?



## Малюнак

Аблачынкі, сонца круг,
а пад імі — рэчка, луг...
І паставіў подпіс Дзіма:
«Гэта ўсё — мая Радзіма!»

*Р. Баравікова.*

Прачытайце верш. Што падказаў вам загаловак тэксту?

**Рм** Як разумее хлопчык значэнне слова *Радзіма*? Як бы вы патлумачылі значэнне гэтага слова?

Спішыце. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**Успомніце**

Што такое асноўная думка тэксту?
Выкарыстайце схему на форзацы.

**34.** Прачытайце.

## Люблю цябе, Белая Русь

Жытнёвае поле, лясы і азёры,
крынічанька ў лузе і ў небе жаўрук —
услухайся толькі, усё тут гаворыць:
люблю цябе, Белая, Белая Русь.

*У. Карызна.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

Што апісвае аўтар? Якое пачуццё да Беларусі перадае? Ці ўказвае загаловак на асноўную думку тэксту?

Спішыце. Падкрэсліце радок верша, у якім выражаецца асноўная думка.

**Завяжы вузялок!**

**Тэкст** — гэта выказванне, у якім некалькі сказаў звязаны паміж сабой па сэнсе.

Сказы ў тэксце аб'яднаны **тэмай** і **асноўнай думкай.** На тэму або асноўную думку можа ўказваць загаловак тэксту.

**35.** Прачытайце сказы. Пастаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Белавежская пушча — адна са славутасцяў Беларусі. Галоўная ўкраса пушчы — белавежскі зубр. Яна знаходзіцца на захадзе нашай краіны. Лясныя жыхары ведаюць, што чалавек — іх сябар і заступнік. Пушчу ахоўваюць людзі.

Пра што гэты тэкст? Які загаловак найбольш падыходзіць да яго: «Пушчы Беларусі», «Белавежская пушча», «Зубры»? Ці ўказвае загаловак на тэму тэксту?



Якую цікавую інфармацыю вы можаце паведаміць пра Белавежскую пушчу? Знайдзіце патрэбныя звесткі ў кнізе «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» або ў інтэрнэце.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**36.** Прачытайце назву тэксту. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова? Прачытайце тэкст.

## Нясвіжскі замак

Кожны беларускі замак цікавы і ўнікальны па-свойму. Без Нясвіжскага замка ўявіць наш край проста немагчыма.

Некалькі стагоддзяў замак з'яўляўся адным з буйны́х культурных цэнтраў. Яго калекцыі не саступалі скарбам самых вядомых музеяў.



За ўсю сваю гісторыю замак зведаў і добрыя, і благія часы. Не так даўно скончылася яго рэстаўрацыя. Замак вярнуўся да нас ва ўсёй сваёй прыгажосці *(Паводле Я. Мілашэўскага)*.

На што ўказвае яго загаловак: на тэму ці на асноўную думку? Чым цікавы і ўнікальны Нясвіжскі замак?

Выпішыце з тэксту сказы, пры дапамозе якіх можна выказаць яго асноўную думку.

**Рм** Ці былі вы ў Нясвіжскім замку? Што вас там асабліва ўразіла, што запомнілася?



Уявіце, што да вас прыехалі сваякі або добрыя знаёмыя з іншай краіны. Якія славутасці вашай мясцовасці можна паказаць гасцям? Што вы можаце расказаць пра гэтыя славутасці?



Спампавана з сайта www.aversev.by



**37.** Прачытайце. Пра што гэты верш?

## Роднае слова

Роднае слова — матчына слова —
з гука*(у/ў)* чаро*(у/ў)*ных выткана мова.
Ціха і светла з яе, бы з крыніцы,
сочацца родныя песні-ж*(ы/і)*віцы...
Родная мова, як і Радзіма:
ж*(ы/і)*ць і любіць без яе немагчыма.

*У. Карызна.*

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

**38.** Прачытайце тэкст. Чаму гарохавая градка самая любімая ў Паўлінкі? Выпішыце з тэксту сказ, які дае адказ на гэта пытанне.

## Паўлінчын гарох

Вакол Паўлінчынай хаты — вялікі агарод. Тут дружна растуць бульба, памідоры, капуста, агуркі, цыбуля, часнок, гарох, фасоля, буракі, морква, перац, гарбузы.

Для Паўлінкі самай любімай з'яўляецца гарохавая градка. Гарох яна садзіла сама.

Тыдні праз два ўсе радочкі на Паўлінчынай градзе зазеленелі лісцікамі. Хутка гарох вырас вышэйшы за Паўлінку і зацвіў. Ён сваімі фіялетавымі і белымі вочкамі з замілаваннем глядзеў на маленькую гаспадыню.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Нарэшце настала ўрачыстая хвіліна. Паўлінка нарвала дзве жмені стручкоў з салодкімі гарошынкамі. Два стручкі дала маме, два — бабулі, два — дзядулю, два — тату і два пакінула сабе *(Паводле І. Муравейкі)*.

На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

Выпішыце з тэксту ў алфавітным парадку назвы агародніны.

**Рм** Раскажыце, якія карысныя справы робіце вы для сваіх родных.

**Гаварыце правільна!**

Два ты́дні, дзве жме́ні, тры стручкі́, чатыры рады́.

**39.** Прачытайце назву верша. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова?

## Гарох пры дарозе

Рос пры дарозе салодкі гарох:
хто б ні ішоў — не спыніцца не мог,
хлопчык малы ці старэнькі дзядок —
кожны адшчыкваў сабе хоць стручок.

А гаспадар — у гуморы: знарок
ён пры дарозе пасеяў гарох.

*І. Муравейка.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

***у гумо́ры** — у настрої*
***знаро́к** — спецыяльна*

Прачытайце верш. Для чаго гаспадар пасеяў гарох каля дарогі? Як вы здагадаліся, што ён паклапаціўся пра падарожнікаў?

Выпішыце сказ, у якім выражаецца асноўная думка верша.

Назавіце словы, правапіс якіх трэба правяраць.

**40.** Прачытайце верш. Якія зычныя гукі часцей паўтараюцца ў ім? Навучыцеся выразна і правільна чытаць яго.

## Бобікаў буданок

Бух, бух, бух,
бух, бух, бух —
**б*(ь/’)*е** па бервянцу абух.
Бервянцо за бервянцом —
будзе ***(Б/б)*обік** мецць свой дом.

*У. Мацвеенка.*

***абу́х** — тупая патоўшчаная частка сякеры*

На што ўказвае загаловак верша: на тэму ці на асноўную думку? Якая асноўная думка верша? Як называецца жыллё для сабакі?

Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**41.** Прачытайце прыказкі і запомніце іх. Чаму так гавораць?

Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
За справу бярэшся — не бойся і не хваліся.

Якая прыказка дапамагае выказаць асноўную думку тэксту з практыкавання 38? Запішыце яе па памяці.



**42.** Прачытайце верш. На што ўказвае яго загаловак: на тэму ці на асноўную думку?

### У лесе

Ёсць за хатай лес густы:
ёсць там елкі, ёсць кусты,
ёсць суніцы, ёсць **ча**рніцы,
ёсць каліна, ёсць маліна,
ёсць а**р**эхі, ёсць г**ры**бы —
ён чакае вас, сяб**ры**!

*У. Мацвеенка.*

Спішыце. Падкрэсліце радок, у якім перадаецца асноўная думка верша.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**43.** Прачытайце тэксты. Якой тэмай яны аб'яднаны?

1. Лістапад у нашым садзе,
лістапад і ліставей.
Вецер лісце ў вальсе кружыць,
загадаю ветру: «Вей!»



Спампавана з сайта www.aversev.by

Ліставей у нашым садзе,
ціхі плёск барвовых хваль...
Тут гучыць і не сціхае
восені апошні баль.

*Т. Мушынская.*



2. Лістапад — біялагічны працэс, пры якім расліны скідваюць сваё лісце. Ён характэрны для асенняй прыроды. Спачатку дрэвы і кусты афарбоўваюцца ў яркія колеры. Праз некаторы час вецер пачынае зрываць чырвонае і жоўтае лісце і несці яго да зямлі. Так прырода рыхтуецца да сустрэчы зімніх халадоў.

Прычынамі гэтай з'явы з'яўляюцца недахоп вады ў замёрзлай зямлі і абарона раслін ад механічных пашкоджанняў у зімовы перыяд.

Якія з тэкстаў можна сустрэць у мастацкай кнізе, а які — у энцыклапедыі? Чаму?

**44.** Прачытайце і адгадайце загадку. Назавіце словы, якія падказалі адгадку.

На зямлю садзяцца сумна
жоўценькія матылі.
Пэўна, у іх пра тое думы,
як зялёнымі былі.

*І. Муравейка.*

Запішыце загадку разам з адгадкай.

**Рм** Раскажыце, што можна зрабіць з асенняга лісця.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Рм** **45.** Прачытайце назву і пачатак апавядання. Што магло здарыцца з лістком клёна восенню?

## Восеньскія прыгоды кляновага лістка

Каля школы расло шмат маладых клёнаў. Восенню лісце на іх стала жоўтае і чырвонае. Лёгкі ветрык наляцеў на дрэвы і закружыў рознакаляровыя лісточкі ў вясёлым карагодзе.

Адзін цікаўны лісток...

***во́сеньскі***

Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце па іх працяг апавядання і запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.












Спампавана з сайта www.aversev.by



**46.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. На што ўказвае загаловак: на тэму ці на асноўную думку?

Ідзе Верасень лесам, прыбірае дрэвы ў дарагія ўборы: бярэзінку — у золата, асіну — у чырвань, дубы ўпрыгожыў меддзю. Не забыўся і пра каліну ды рабіну, прыхарашыў іх пацеркамі чырвонымі.

Азірнуўся Верасень: гарыць-палае асенні лес! *(Паводле К. Каліны)*.

Запішыце тэкст разам з загалоўкам.

## План тэксту

**47.** Прачытайце тэкст. Якую песню іграла дзяўчынка? Чаму ноты з песні падхапілі людзі і птушкі?

### Любімая песня

Дзяўчынка іграла на раялі. Яе пальчыкі шпарка бегалі па клавішах. Нот набралася многа-многа! Яны звонкімі гарошынамі рассы́паліся па падлозе, пакаціліся на балкон, а з балкона — на тратуар.

Па тратуары ішлі людзі. Прахожыя лавілі ноты і з добрай усмешкай неслі іх з сабой. Гэта былі іх любімыя ноты. Дзяўчынка іграла пра мір, пра дружбу, пра шчасце.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Малая іграла. Нот было так многа — звонкіх, радасных, пявучых! Людзі не маглі іх сабраць. Прыляцелі птушкі, падхапілі ноты і паляцелі з імі па ўсёй зямлі. Так разнеслася песня пра мір *(Паводле А. Кобец-Філімонавай)*.

На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

**48.** Разгледзьце малюнкі. Падзяліце тэкст практыкавання 47 на часткі.







Зачытайце часткі тэксту, якія адпавядаюць кожнаму малюнку. Падбярыце загаловак да кожнай часткі. Запішыце загалоўкі, пазначце іх лічбамі.

План

1. ...
2. ...
3. ...

**Завяжы вузялок!**

План раскрывае змест тэксту і перадае паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**49.** Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку? Якога слова не ведала дзяўчынка?

## Распрані яе

На ўскрайку прысядзібнага ўчастка Дашына бабуля пасеяла гарбузы. Восенню гарбузы выраслі вялікія-вялікія. І нават паспелі.

Хадзілі каля іх куры ды і дзяўбці пачалі, нават семкі лушчыць узяліся.

Даша ўбачыла гэта, узяла некалькі спелых семак, прыносіць да бабулі, падае́ семку і просіць:

— Распрані яе! *(Паводле П. Кавалёва)*.

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Пастаўце пытанні да кожнай часткі тэксту і запішыце яго план.

План

1. Калі ...?
2. Што ...?
3. Пра што ...?

Спішыце першую частку тэксту.

**Завяжы вузялок!**

Пры складанні плана можна:

1) выдзяляць галоўнае ў кожнай частцы тэксту і даваць ёй назву;

2) ставіць пытанне да кожнай часткі тэксту.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**50.** Прачытайце тэкст. Падзяліце яго на часткі. Выкарыстайце прапанаваны план.

## Клапатлівая гаспадыня

Ваверка — клапатлівая гаспадыня. На зіму яна нарыхтоўвае сабе запасы з арэхаў, жалудоў. Ваверка збірае і грыбы. Восенню ў лесе можна заўважыць незвычайную з'яву. На сучку дрэва прычэплена апенька ці іншы грыбок. Гэта работа ваверкі. Грыбы сохнуць на паветры. Зімой яны спатрэбяцца гаспадыні *(Паводле В. Вольскага)*.

План

1. Чаму ваверку называюць клапатлівай гаспадыняй?
2. Што можна заўважыць восенню ў лесе?
3. Для чаго ваверка чапляе грыбы на сучкі дрэў?

Запішыце другую частку тэксту.

**51.** Прачытайце тэкст. Што можна ўбачыць на лясным возеры? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

## На лясным возеры

Стары лес высокай і цёмнай сцяной абступіў возера. Свежае паветра насычана пахам лазы і балотных раслін.



Спампавана з сайта www.aversev.by

У маленькіх затоках паверхня вады пакрыта зялёнай ра́скай. Белыя гарлачыкі раскрыліся насустрач сонцу. На адным з лістоў сядзіць нерухома зялёная жаба. Вочы яе абведзены залацістым абадком. Над вадою лятаюць стракозы. Яны таксама садзяцца на бліскучыя цвёрдыя лісты гарлачыкаў.

У ціхай і цёплай вадзе кіпіць жыццё. Плаваюць залацістыя карасікі. Усплывае сур'ёзны вадзяны жук-плывунец *(В. Вольскі)*.



На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План

1. Жыццё ў вадзе.
2. На паверхні возера.
3. Вакол возера.

Запішыце выпраўлены план. Спішыце тую частку тэксту, да якой прапанаваны малюнак.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**52.** Прачытайце. Што парушана ў тэксце?

## Лясная яблыня

Раптам на галіну села нейкая птушка і распачала знаёмства з яблынькай. Яна так клявала яблык, што некалькі кавалачкаў упала на зямлю. Прыляцела яшчэ некалькі птушак. Яны, мабыць, здагадаліся, што мы хочам выкапаць яблыню, і зляцеліся, каб апошні раз паласавацца сакавітымі пладамі.

Мне і брату расхацелася перавозіць дрэўца ў вёску. Яблыня лясным жыхарам патрэбна больш, чым нам.

Брат сказаў, што дзікія яблычкі становяцца смачныя зімой. Тады я прапанаваў выкапаць яблыньку і перавезці ў наш сад. Валодзя пагадзіўся.

Мы з братам наткнуліся ў лесе на дзікую яблыню. Лісце яе пачало ападаць, а невялічкія яблычкі моцна трымаліся за галінкі. Я паспытаў адно — яно было цвёрдае і кіслае *(Паводле І. Муравейкі)*.

Аднавіце паслядоўнасць частак тэксту. Выкарыстайце прапанаваны план.

План

1. Што знайшлі хлопчыкі ў лесе?
2. Што яны захацелі зрабіць з яблынькай?



Спампавана з сайта www.aversev.by

3. Хто прыляцеў частавацца ляснымі яблычкамі?
4. Чаму хлопчыкі пакінулі яблыньку ў лесе?

Вусна перакажыце тэкст.
На што ўказвае загаловак тэксту?
Запішыце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту.

**53.** Вусна складзіце па падказках алгарытм пабудовы плана тэксту.

**1. Чытаем ..., дзелім яго на сэнсавыя ... .**

**Удод**

Удод — чубаты прыгажун. Цэлы дзень жучкоў збірае, і чуваць аж за вярсту яго скарга: «Пуста тут!»

Удод не ладзіць гнязда. Ён селіцца ў старым дупле або ў шпакоўні.

Летам там аж цесна бывае ад птушанят. Усе яны ў рознакаляровых каптаніках *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

**2. Вылучаем галоўнае ў ... .**

1) Удод — чубаты прыгажун. Цэлы дзень жучкоў збірае, і чуваць аж за вярсту яго скарга: «Пуста тут!»

2) Удод не ладзіць гнязда. Ён селіцца ў старым дупле або ў шпакоўні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

3) Летам там аж цесна бывае ад птушанят. Усе яны ў рознакаляровых каптаніках.

**3. Даём назву … .**

План
1. Чубаты … .
2. Удод … .
3. Птушаняты … .



**54.** Запішыце план тэксту з практыкавання 53.

**Завяжы вузялок!**

**План** — гэта кароткая праграма, якую трэба намеціць пры падрыхтоўцы да сачынення, паведамлення, пераказу.

**55.** Прачытайце тэкст.

## Адказны за прыроду

Алёшка вучыцца ў трэцім класе. Яго прызначылі адказным за прыроду. Аднак ніякай прыроды ў класе няма.

Ды хлопчык знайшоў сабе работу. Не ўсе птушкі ляцяць у вырай. Вераб'і, сініцы, снегіры застаюцца зімаваць. Некаторыя гінуць.

Алёшка рашыў дзейнічаць. Ён стварыў сталоўку для птушак. На сасне і бярозе прыладзіў



Спампавана з сайта www.aversev.by

дошчачкі на шнурках. На дошчачкі хлопчык сыпаў хлебныя крошкі, крупы.

Птушкі прыпісаліся да сталоўкі. Кожны дзень дошчачкі чыстыя *(Паводле І. Навуменкі)*.

Чаму Алёшу можна назваць адказным чалавекам? Якую добрую справу ён сам вырашыў зрабіць? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце і запішыце яго план.

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане, выкарыстаўшы прапанаваныя словы і спалучэнні слоў.

1) вучыцца **ў** т**р**эцім класе, прызначылі, прыроды няма;

2) знайшоў работу, л**я**цяць **у** вырай, застаюцца зімава**ць**, гіну**ць**;

3) рашыў **дзейніча**ць, стварыў сталоўку, прыладзіў дошчачкі, сыпаў крошкі, крупы;

4) прыпіса́ліся да сталоўкі, **чы**стыя.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

**56.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Дзве работы за раз не зробіш.
Пчолка маленькая, а мёду колькі наносіць!
Па рабоце майстар відаць.

Якія з прыказак падыходзяць для характарыстыкі галоўнага героя тэксту з практыкавання 55?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Рм **57.** Уявіце сябе журналістамі. Вам трэба ўзяць інтэрв'ю ў незнаёмага чалавека і даведацца пра яго любімы занятак. Запішыце пытанні ў патрэбнай паслядоўнасці.

У чым яго карысць? Які ваш любімы занятак? Чаму вы параілі б заняцца гэтым вашым знаёмым?

План
1. …
2. …
3. …

Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра свой любімы занятак, адказаўшы на гэтыя пытанні.



Раскажыце, што вы ведаеце пра прафесію журналіста. Як бяруць інтэрв'ю? Пры неабходнасці запытайцеся ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

Рм **58.** Выкарыстаўшы план з практыкавання 57, складзіце і запішыце паведамленне на тэму «Любімы занятак вучняў нашага класа». Калі такога агульнага занятку ў вас яшчэ няма, падумайце і раскажыце, чым бы вы хацелі займацца ўсе разам.



**59.** Прачытайце тэкст. Якую добрую справу зрабілі дзеці? Як гэта характарызуе іх?

## Дашына аб'ява

Да брамкі нашага двара колькі дзён за́пар падыходзіў чорны-чорны, высокі і прыгожы саба-



Спампавана з сайта www.aversev.by

ка. Ён лажыўся на траўку і чакаў якога-небудзь наедку.

Дзеці першыя пра гэта здагадаліся і, назваўшы сабаку Чарлі, пачалі падкормліваць яго. Сабака з ахвотаю прымаў ласункі і адзываўся на дадзенае яму імя.

Адна з унучак гаспадара двара, Даша, вырашыла дзейнічаць. Узяла аркушок тоўстай паперы, каляровыя алоўкі і напісала аб’яву: «Чорны, высокі, з белаю плямаю на лбе сабака, адзываецца на клічку “Чарлі”, шукае гаспадара» *(Паводле П. Кавалёва)*.

***за́пар*** — рус. *подряд*
***бра́мка*** — *веснічкі*; рус. *калитка*
***нае́дак*** — тут: *ежа*

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце і запішыце яго план.

## Адкажыце на пытанні

1. Што такое тэкст?
2. На што можа ўказваць загаловак тэксту?
3. Што такое тэма тэксту?
4. Што такое асноўная думка тэксту?
5. Што раскрывае і перадае план тэксту?
6. Як скласці план тэксту?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*



Спампавана з сайта www.aversev.by

# СКАЗ

## Прыметы сказа

**60.** Прачытайце тэкст. Вызначце межы сказаў.

### Падрыхтоўка да зімы

старанна рыхтуецца да зімы барсук ён замяняе ў нары падсцілку звер дабаўляе да лісця сцяблінкі рамонкаў і галінкі чаромхі яны выганяюць надакучлівых насякомых і шкодных мікробаў барсук ведае сакрэт моцнага зімовага сну (*Паводле Я. Галубовіча*).

Колькі сказаў у тэксце? Што выражаецца ў кожным сказе? Запішыце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту. Правільна аформіце яго на пісьме.

**Завяжы вузялок!**

**Сказ** — гэта слова або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку.

**61.** Прачытайце. Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў сказы. Па якіх прыметах вы гэта зрабілі?

Ці любіце вы гуляць у камп'ютарныя гульні?
Верачка хуценька сабралася ў … .



Спампавана з сайта www.aversev.by

Часцей выкарыстоўвайце камп'ютар для вучобы.

Андрэйка, на, гуляць, любіць, сябрамі, з, пляцоўцы, спартыўнай.

Нельга доўга сядзець за камп'ютарам!

Запішыце сказы. Якія знакі прыпынку вы паставілі ў канцы іх?

Што трэба зрабіць, каб астатнія спалучэнні слоў ператварыць у сказы? Вусна ўтварыце сказы.

**Рм** Раскажыце, якія правілы работы за камп'ютарам вы ведаеце.

**62.** Прачытайце.

Дрэвы наляцелі на вецер. Загайдаліся верхавіны бяроз і клёнаў. Пасыпаліся на неба жоўтыя лісточкі. Апалае лісце ціха шапаціць пад нагамі. Аленка з татам любяць лятаць у асеннім парку.

Назавіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Выпраўце памылкі і запішыце сказы.

**63.** З асобных слоў складзіце і запішыце прыказкі. Чаму так гавораць?

Гнуткага, не, вецер, дрэва, зломіць.
Зямля, дзякуе, заўсёды.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Рм** **64.** Складзіце сказы па пачатку. Улічыце апісаную сітуацыю. Выразна вымавіце сказы, якія ў вас атрымаліся.

**Сітуацыя 1.** Табе трэба напісаць маме запіску і паведаміць, куды ты пайшоў (пайшла).

Напрыклад: *Мамачка, я пайшла да сяброўкі ў госці.*

Мамачка, … .

**Сітуацыя 2.** Ты чакаеш маму з працы. Яна патэлефанавала табе. Пра што ты запытаешся ў яе?

Напрыклад: *Мамачка, мне ўжо можна накрываць на стол?*

Мамачка, …?

**Сітуацыя 3.** У мамы свята. Якімі словамі ты павіншуеш яе?

Напрыклад: *Мамачка, віншую цябе з Днём маці!*

Мамачка, …!



**65.** Прачытайце тэкст. Вызначце межы сказаў.

## Шчодрая восень



ідзе восень па л..сах і палях усё аж зіхаціць пазалотай і чырванню ў прыполе н..се шчодрая вос..нь слівы і грушы для ўсіх падрыхтавала яна пачастунак (*Паводле М. Даніленкі*).



Спампавана з сайта www.aversev.by

***прыпо́л** — ніжні край сукенкі, спадніцы*

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Правільна афарміце сказы на пісьме.

## Тыпы сказаў

**66.** Прачытайце тэкст. Які музычны інструмент зачараваў Ліну? Выразна прачытайце сказ, у якім перадаецца жаданне дзяўчынкі. Які знак прыпынку стаіць у канцы гэтага сказа?

### Флейта

Ужо трэцюю раніцу Ліна прачыналася ад лагодных гукаў. І гэта не клапатлівы голас маці і не



мурканне пяшчотнай коткі. Ужо трэцюю раніцу дзяўчынка прачыналася з першымі праменьчыкамі сонца. Яна быццам чула, як яно жартаўліва выглядвае з-за рэчкі. Адкуль жа гэтыя чароўныя гукі?



Спампавана з сайта www.aversev.by

На балконе суседняга дома стаяла дзяўчына і прыціскала да вуснаў срэбраную дудачку. Вось бы Ліне навучыцца так іграць!

Пазней дзяўчынка даведалася, што гэта флейта. Каб іграць на ёй, **музы́ка** прыціскае флейту да вуснаў і ўдзімае ў яе паветра *(Паводле В. Прохаравай)*.

Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім выражаецца пытанне. Знайдзіце і прачытайце адказ на яго. Запішыце гэтыя сказы.

Што абазначае выдзеленае слова? Вымавіце яго з націскам на іншым складзе, каб змяніўся сэнс слова. Прыдумайце сказ з гэтым словам.

**Завяжы вузялок!**

У сказе можа выражацца паведамленне, пытанне, парада, загад, просьба.

**67.** Выразна прачытайце сказы. У якім сказе выражаецца паведамленне, у якім — пытанне, у якім — пабуджэнне да дзеяння?

Якую музыку ты любіш слухаць?
Мая сяброўка любіць паслухаць музыку.
Давайце танцаваць пад гэтую музыку.

1. |апав.|.   2. |пыт.|?   3. |пабудж.|.

Якому са сказаў адпавядае кожная схема? Выпішыце пытальны сказ.

**Рм** Вусна адкажыце на пытанне, якое вы запісалі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Па мэце выказвання сказы падзяляюцца на апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя.**

**68.** Прачытайце сказы. Разгледзьце схемы да іх. Спішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы.

Гэта вялікая сям'я музычных інструментаў. Паслухайце чароўную музыку ў выкананні сімфанічнага аркестра. Наведайце з бацькамі тэатр або філармонію! Што такое сімфанічны аркестр?

1. | пыт. ? 2. | апав. . 3. | пабудж. ! 4. | пабудж. .

Што атрымалася ў выніку спісвання? Вусна дайце назву тэксту.

**69.** Вусна дапоўніце размову бабулі і ўнука патрэбнымі сказамі па схемах.

— | пыт. ?

— Я, унучак, люблю слухаць народныя песні. А якія песні слухаеш ты са сваімі сябрамі?

— | апав. .

— Давай паслухаем тваю любімую песню разам.



Назавіце ў тэксце пабуджальны сказ.



Спампавана з сайта www.aversev.by

 **70.** Прачытайце сказы. Вызначце іх віды па мэце выказвання.

Грэбнем называюць лёгкую пласцінку з зубамі. Якая пара года надышла? Раней свой грэбень быў у кожнай жанчыны і дзяўчынкі. Доўгія валасы расчэсвалі грэбнем, запляталі ў косы. Давайце сходзім сонечным асеннім днём у журавіны! Ён быў вядомы як музычны інструмент. Умельцы закладвалі ў яго палоску паперы і дзьмулі. Якія гукі можна пачуць у лесе восенню?

Выпішыце апавядальныя сказы.

Што атрымалася ў выніку спісвання? Вусна дайце назву тэксту.

## Апавядальныя сказы

**71.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы. Якім сказам можна падпісаць кожны малюнак?







Дажджавыя кроплі застукалі ў вокны.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Густы туман узнімаецца над лугам.
Клёны абступілі бераг возера.

Які знак прыпынку стаіць у канцы кожнага сказа? Запішыце сказы з прыназоўнікамі.

Сказ, у якім паведамляецца пра падзеі, з'явы, называецца **апавядальным.** У канцы апавядальнага сказа ставіцца кропка.

**72.** Падзяліце тэкст на сказы. З якіх сказаў па мэце выказвання складаецца тэкст? Запішыце, правільна афармляючы сказы на пісьме.



адмірал — гэта вялікі дзённы матыль размах крылаў у яго дасягае шасці сантыметраў адмірал сустракаецца паўсюдна ў Беларусі сваю назву матыль атрымаў за прывабную афарбоўку *(Паводле В. Гардзея)*.

Якая інфармацыя пра матыля змешчана ў першым сказе тэксту? Другім? Трэцім? Чацвёртым?

## Завяжы вузялок!

У апавядальных сказах голас павышаецца ў пачатку сказа і паніжаецца ў канцы. З большай сілай голасу вымаўляюцца галоўныя па сэнсе словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**73.** Прачытайце адзін і той жа апавядальны сказ так, каб ён даваў адказ на тры розныя пытанні. Па стрэлках сачыце за павышэннем і паніжэннем голасу ў сказе.

Хто шчабеча на высокай ліпе?

На высокай ліпе| шчабеча **шпа́к**.

Дзе шчабеча шпак?

На **высокай лі́пе** шчабеча шпак.

На якой ліпе шчабеча шпак?

На **высо́кай** ліпе шчабеча шпак.

**74.** У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні і выпішыце яго. Растлумачце свой выбар.

1. Сыраежкі лічацца модніцамі сярод грыбоў. Дзядуля, давай пойдзем у грыбы. Збірайце тыя ядомыя грыбы, якія добра ведаеце.

2. Ці бачылі вы сыраежкі? Кожны грыбок мае адметную вопратку. Дзе растуць сыраежкі?

3. Якога колеру капелюшы ў сыраежак? Капялюшыкі пафарбаваны ў розныя колеры і адценні. Дзе ўзялі яны столькі фарбаў?

Прачытайце сказы. Што яны ўтвараюць? Дайце назву тэксту.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**75.** З асобных слоў складзіце сказы. Якія яны па мэце выказвання?

1) над, звініць, полем, жаваранак; 2) уздо..ж, стаялі, стройныя, дарогі, таполі; 3) мы, дарогай, л..гавой, ехалі; 4) голле, у, садах, яблынь, гнулася, ад, антонавак, сакавітых; 5) у, зоркі, небе, начным, мільгацелі.

Спішыце, правільна афарміце сказы на пісьме. Праверце правільнасць напісання ***у*** або ***ў***.

## Пытальныя сказы

**76.** Паслухайце верш вучня. Колькі пытанняў у ім? Прачытайце пытанні, якія хлопчык задае сабе. Як ён адказвае на іх? А як бы вы адказалі на першае пытанне верша?

**Што мы называем**
**сваім родным краем?**
Можа, той куток зямлі,
дзе дзяды нашы жылі?
Можа, гэта наша хата,
дзе гасцей заўжды багата?
Можа, сцежка ў ціхім лесе?
Можа, птушка ў паднябессі?
Можна ўсё пералічыць,
без чаго нам не пражыць.





Спампавана з сайта www.aversev.by

Як мне выбраць і рашыць?
**Родны край жыве ў душы.**
*А. Калаткоў.*

Спішыце выдзеленыя сказы.

Сказ, у якім выражаецца пытанне, называецца **пытальным**. У канцы пытальнага сказа ставіцца пытальнік.

**77.** Сярод сказаў знайдзіце апавядальныя і выразна прачытайце іх.

1. Хутка пачнуцца канікулы. **Ху́тка** пачнуцца канікулы?
2. Ты пойдзеш у цырк. Ты **по́йдзеш** у цырк?
3. Я паеду да бабулі ў госці. Я паеду да **бабу́лі** ў госці?
4. Мы наведаем выставу. Мы наведаем **віста́ву**?

Прачытайце пытальныя сказы з павышэннем голасу на выдзеленых словах. Чым падобныя сказы ў парах? Чым яны адрозніваюцца?

Спішыце пытальныя сказы.

**Завяжы вузялок!**

У пытальным сказе голас рэзка павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пытанне.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**78.** Прачытайце пытальны сказ некалькі разоў. Зрабіце гэта так, каб адказам на яго стаў па чарзе кожны з апавядальных сказаў.

Ты паклаў сшытак на стол?

Не, гэта зрабіў **Сяргей.**

Не, я паклаў на стол **дзённік.**

Я паклаў сшытак у **рукзак.**

Запішыце сказы, у якіх сустрэлася слоўнікавае слова.

*сшытак*

**79.** Прачытайце загадку. Што трэба паставіць у канцы сказа? Назавіце слова-адгадку.



Чым можна гальштук завяза**ць**
і хутка**сць** суднаў вымяра**ць**

*У. Мазго.*



Спішыце загадку. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



**80.** Прачытайце верш. Што выклікала ў вас усмешку? Якія чайнікі пераблытаў герой верша?

На пліце зачмыхаў чайнік.
Я да чайніка — бягом.
Дзе знайсці ў ім
выключальнік,
каб не чмыхаў на ўвесь дом?



Спампавана з сайта www.aversev.by

Я шукаю выключальнік,
ды ніяк вось не знайду.
Трэба ж,
каб не чмыхаў чайнік,
выключыць пад ім пліту.

*А. Зэкаў.*

Выпішыце з верша пытальны сказ і адказ на гэта пытанне. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**81.** Складзіце пытанні да прапанаваных адказаў і запішыце іх. Падкрэсліце словы, з якіх пачынаюцца пытальныя сказы.

Наташа заняла першае месца ў алімпіядзе па матэматыцы. — Хто ...?

Спартыўныя спаборніцтвы прайшлі на школьным стадыёне. — Дзе ...?

Учора нашу школу наведалі замежныя госці. — Калі ...?

Вучні ездзілі на экскурсію ў Белавежскую пушчу. — Куды ...?

**Завяжы вузялок!**

Пытальныя сказы могуць утварацца з дапамогай спецыяльных пытальных слоў: ***дзе, калі, ці, хто, што, куды, колькі, як.*** У такім пытальным сказе голас павышаецца на пытальным слове.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**82.** Прачытайце загадкі-пытанні і адгадайце іх. Якая загадка мае дзве адгадкі? Вусна складзіце апавядальныя сказы, якія з'яўляюцца адказамі на пытанні.

1. Што ляціць без крылаў? 2. Што чалавеку самае мілае? 3. Чаго не абнясеш вакол хаты? 4. Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады?

А д г а д к і: *думка, сон, на глобусе і карце, вецер, вады ў рэшаце.*

Спішыце загадкі. Падкрэсліце ў іх пытальныя словы.

**83.** Выразна прачытайце пытальныя сказы. Назавіце пытальныя словы ў іх.



**Як** выглядае бусел?

**Якія** жывёлы лічацца сімваламі Беларусі?

**Дзе** можна ўбачыць зубра?



Якім з гэтых сказаў трэба дапоўніць наступны тэкст?

## Сімвалы Беларусі

[ ]? Канешне, гэта зубр і бусел. Зубр сімвалізуе працавітасць і жыццёвую сілу беларускага народа. Бусел — нацыянальную чысціню.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Зубр Волат стаў талісманам Чэмпіянату свету па хакеі — 2014 у Мінску.

Запішыце сказ, якім дапоўнілі тэкст. Падкрэсліце ў ім пытальнае слова.

**84.** Дзеці з настаўніцай упершыню прыехалі ў Мінск на хакейны матч. З якімі пытаннямі яны павінны звярнуцца да жыхароў горада, каб трапіць на гульню?



1. Прабачце, калі ласка. **Як** ...?



2. Выбачайце, калі ласка. На **якім** ...?



3. **Ці** выходзіце ...?




4. Добры дзень. **Колькі** ...? **Ці** можна купіць ...?

Складзіце пытанні, якія трэба задаць у сітуацыях, паказаных на малюнках.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**85.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку да гэтых загадак. Паспрабуйце растлумачыць, чаму ў загадак такая адгадка.

1. Хочаш выправіцца ў казку
ці на Месяц? Калі ласка!
Гэта што за хуткалёт,
што бярэ ў такі палёт?

*У. Паўлаў.*

у а д м к

2. Што хутчэйшае за ўсё на свеце?



***вы́правіцца** — адправіцца*

Спішыце пытальныя сказы.

## Пабуджальныя сказы

**86.** Прачытайце. У якім сказе перадаецца просьба? Загад? Заклік? Парада?

1. Паўлік, схадзі, калі ласка, у магазін. 2. Святланка, лепш паўтары правіла перад выкананнем задання. 3. Дзеці, перастаньце спрачацца. 4. Беражыце родную прыроду!

Спішыце сказ, у якім выражаецца заклік.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Сказ, у якім выражаецца просьба, загад, парада, заклік да дзеяння, называецца **пабуджальным** сказам. У канцы пабуджальнага сказа ставіцца кропка або клічнік.

**87.** Паслухайце верш. Якую параду дае аўтар? Якія сказы ўжываюцца ў вершы?

### Асцярожна на шашы!

Небяспечную дарогу
**не перабягай** —
ці ты коцік,
ці ты вожык,
ці ты зай.
Калі нават лось рагаты —
без аглядкі **не бяжы.**
Вось вам шчырая парада:
**асцярожна** на шашы.

*Г. Каржанеўская.*

Выразна прачытайце верш, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы. Спішыце першы і другі сказы верша. Падкрэсліце словы, у якіх выражаецца парада.

**Завяжы вузялок!**

У пабуджальным сказе голас павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пабуджэнне да дзеяння.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**88.** Складзіце па малюнках пабуджальныя сказы-парады.



1. Пераходзьце вуліцу на ... .



2. Не гуляйце ... .



3. Абавязкова прычапіце ... .



4. Пераходзьце вуліцу па ... .

Запішыце два сказы на выбар.

**89.** З прапанаваных частак складзіце і запішыце прыказкі. Чаму так гавораць?

| | |
|---|---|
| **Думай** з вечара, | *а **гавары** мала.* |
| **Слухай** многа, | *а **рабі** з рання.* |

Апавядальнымі ці пабуджальнымі сказамі з’яўляюцца прыказкі? Што ў іх выражаецца: просьба ці парада? Выразна прачытайце прыказкі, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**90.** Прачытайце. З якімі парадамі звяртаецца паэт да чытачоў? Якія сказы ён выкарыстоўвае ў вершы?

Пачынай*(т/ц)*е *(д/дз)*ень з усмешкі,
з добрых, *(т/ц)*ёплых слоў, —
і атуляць вас, акрыля*(т/ц)*ь
ласка і любоў.
Пачынай*(т/ц)*е *(д/дз)*ень з на*(д/дз)*еі,
казачнай, як сон, —
і на працы вас ус*(т/ц)*ешыць
спраў і думак плён.

*М. Маляўка.*



***плён*** — *вынік, здабытак*; рус. *плоды труда*

Запішыце адну з парад, устаўляючы патрэбныя літары. Назавіце ветлівыя словы і пажаданні сваякам, якія можна выкарыстоўваць раніцай.

**91.** Выразна прачытайце сказы. Выпішыце пабуджальныя сказы. У якім з іх перадаецца просьба? Загад? Запрашэнне?

1. Даніла падрыхтаваўся да ўрока беларускай мовы. Даніла, ты падрыхтаваўся да ўрока беларускай мовы? Даніла, пачынай рыхтавацца да ўрока беларускай мовы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Вераніка, пакажы, калі ласка, усім свой альбом. Вераніка паказала ўсім свой альбом. Вераніка, ты пакажаш свой альбом?

3. Бабуля, ты прыедзеш да нас у госці? Бабуля, прыязджай да нас у госці ў нядзелю. Да нас у госці прыязджае бабуля.

**92.** Прачытайце і разгадайце шараду. Запішыце слова-адгадку.

Паверхневую частку дрэва
ты **напішы**, мой дружа, злева.
А справа месца **дапішы**,
дзе любяць плаваць малышы.
Цяпер **чытай** усё з паперкі —
і ўбачыш цвёрдыя цукеркі.

*У. Мазго.*



Выразна перачытайце пабуджальныя сказы, вымаўляючы выдзеленыя словы з большай сілай голасу.

**93.** Прачытайце. Калі вымаўляюць або спяваюць гэтыя творы? Які з іх з'яўляецца заклічкай, а які — калыханкай? Па якіх сказах вы пра гэта здагадаліся?

1. Дожджык, дожджык, секані,
   нібы з рэшата, ліні!
   Лі на пашы, на гаі.
   Дожджык, дожджык, секані!



Спампавана з сайта www.aversev.by

2. А ты, каток шэры,
у цябе хвосцік белы.
Прыйдзі, каток, начаваць
і дзіця́тка калыхаць.

***за́клічка** — дзіцячая песенька, у якой звяртаюцца да з’яў прыроды*

Спішыце тэкст, у якім усе сказы пабуджальныя.

**Гаварыце правільна!**

Ліць ваду — лі ваду, піць ваду — пі ваду, біць у барабан — бі ў барабан, віць вяроўку — ві вяроўку.

**94.** Вусна дапоўніце размову мамы і дачушкі патрэбнымі сказамі па схемах.



М а м а. Маша, мне трэба згатаваць вячэру, а Міхаська яшчэ не спіць.

М а ш а. | пыт. | ?

М а м а. | пабудж. | .

М а ш а. Добра, я пакалышу браціка.

Выразна вымавіце пабуджальны сказ. Што ў ім выражаецца: просьба ці парада? Якую калыханку дзяўчынка можа праспяваць брацiку?



Спампавана з сайта www.aversev.by



**95.** Выразна прачытайце заклічкі, вымаўляючы выдзеленыя словы з большай сілай голасу. З якіх сказаў складаюцца заклічкі?

1. Божая кароўка,
**паляці** на неба:
там твае дзетачкі
ядуць цукерачкі.
Сама **паясі**
і нам **прынясі.**

2. Сонейка-сонца,
**выглянi** ў аконца,
**пасвяці** нам трошкі,
дам табе гарошку.

Спішыце заклічку, якую вымаўляюць у пахмурны дзень. Вывучыце яе.

## Клічныя сказы

**96.** Разгледзьце малюнкі. Выразна прачытайце сказы пад малюнкамі з улікам паметак у слупку справа.



| | |
|---|---|
| — Якую адзнаку ты атрымаў за дыктант? | *спакойна, з цікавасцю* |
| — Я атрымаў за дыктант дзясятку. | *спакойна, з задавальненнем* |



Спампавана з сайта www.aversev.by



— Я атрымаў за дыктант дзясятку!

— Ты атрымаў дзясятку?! Малайчына, сынок!

*з вялікай радасцю*

*з радасным здзіўленнем*

*з задавальненнем*



— Паўлік, сядай хутчэй за стол! Паглядзі, які мы з мамай пірог спяклі!

— Сынок, сядай за стол побач з Палінкай.

*з вялікай радасцю*

*спакойна і ласкава*

Прачытайце сказы, у якіх выражаецца:
1) паведамленне;
2) пытанне;
3) запрашэнне да дзеяння.

Якія з іх вымаўляюцца з моцным пачуццём? Што стаіць у канцы гэтых сказаў? Выпішыце іх.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Сказ, у якім выказваецца моцнае пачуццё, называецца **клічным**. У канцы апавядальнага клічнага і пабуджальнага клічнага сказаў ставіцца клічнік (!). У канцы пытальнага клічнага сказа ставяцца пытальнік і клічнік (?!).

**97.** Выразна прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на знакі прыпынку ў канцы іх.

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі.**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі!**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі?**

Заўтра мы паедзем у **Дуду́ткі?!**

Давайце заўтра паедзем у **Дуду́ткі.**

Давайце заўтра паедзем у **Дуду́ткі!**






Назавіце: а) апавядальныя; б) пытальныя; в) пабуджальныя сказы. Якія з іх з'яўляюцца клічнымі? Выпішыце пытальны клічны сказ.

**Рм** Раскажыце, што вы ведаеце пра музей старажытных рамёстваў «Дудуткі».



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Завяжы вузялок!**

Клічныя сказы вымаўляюцца больш высокім тонам з выдзяленнем слова, якое выражае пачуццё радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення.

**98.** Выразна прачытайце клічныя сказы. Якія з іх з'яўляюцца апавядальнымі, якія — пытальнымі, а якія — пабуджальнымі?

1. Хто намаляваў такі незвычайны малюнак?! 2. Мілая бабуля, раскажы мне казку! 3. Як прыемна гуляць сонечным днём у лесе! 4. Сябры, давайце дапаможам птушкам! 5. Дзе растуць такія прыгожыя кветкі?! 6. Дзяўчынкі, давайце гуляць усе разам!

Выпішыце пабуджальныя клічныя сказы.



**99.** Прачытайце верш. На што ён падобны: на заклічку ці на лічылку?

Дождждык, дожджык залаты,
не мінай нікога ты.
Гулкім громам грукачы!
Мы паспеем у*(т/ц)*ячы,
мы не бу*(д/дз)*ем оха*(т/ц)*ь,
нас не напалоха*(т/ц)*ь!

*К. Буйло.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Падкрэсліце пабуджальныя сказы.

Назавіце клічныя сказы. Навучыцеся выразна чытаць верш.

**100.** Разгледзьце малюнкі. Выразна прачытайце сказы. Да якога з малюнкаў падыходзіць кожны сказ?











1. Як праверыць правапіс прапушчаней літары?
2. Як прыемна ў парку сонечным днём!
3. Колькі прыкладаў запісана на дошцы?
4. Колькі фарбаў падарыла восень дрэвам!

Запішыце клічныя сказы. Якія пачуцці (захапленне, здзіўленне, смутак, вялікае задавальненне) у іх перадаюцца? Падкрэсліце слова, з якога пачынаецца кожны сказ.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Завяжы вузялок!

Клічныя сказы могуць пачынацца словамі, якія дапамагаюць перадаць пачуцці радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення: ***колькі, як, які, эх, ай, о, ой, няхай (хай), дык.***

**101.** Выразна прачытайце верш. Якая спадчына нам засталася ад продкаў? Як яе захаваць і перадаць іншым пакаленням?

### Мы — беларусы

Мы жывём на зямлі,  
той,  
што лёсам нам дадзена,  
дзе адвеку жылі  
нашы мудрыя прадзеды.  
Як жа іх не згадаць,  
што змаглі нам у спадчыну  
гэты край перадаць  
з мовай роднаю,  
матчынай?!

*А. Зэкаў.*

***лёс*** — *доля, жыццё*; рус. — *судьба*

Спішыце пытальны клічны сказ. Падкрэсліце слова, якім ён пачынаецца.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**102.** Прачытайце віншаванне. Назавіце ў ім пабуджальны клічны сказ. Якім словам ён пачынаецца?

Дарагі сябар!

Прымі мае віншаванні з днём нараджэння. Я жадаю табе здароўя і поспехаў у вучобе. Няхай збудуцца ўсе твае мары!

Сяргей.

**Рм** З чым людзі могуць павіншаваць адзін аднаго? Складзіце па гэтым узоры віншаванне аднаму са сваіх сваякоў. Запішыце.

**103.** Прачытайце вершаваныя радкі з моцным пачуццём радасці. Які знак прыпынку трэба паставіць у канцы сказа?

Святкуй, спявай, мой родны край,
усмешкай светлай шчыра ззяй

*У. Мацвеенка.*



**104.** Прачытайце сказы з моцным пачуццём.

1. Колькі хараства і чароўнага прывабу ў сініх далях *(Я. Колас)*. 2. Якія знаёмыя назвы і словы, якая цудоўная родная мова *(П. Панчанка)*. 3. Ой, як не хочацца расставацца *(П. Рунец)*. 4. Дык



Спампавана з сайта www.aversev.by

няхай завеі нам лыжню навеюць *(М. Сазончык)*. 5. Гэй, памочнікі, пара абедаць *(П. Рунец)*.

Спішыце, пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце словы, з якіх пачынаюцца клічныя сказы.

## Галоўныя і даданыя члены сказа

### Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа

**105.** Спішыце, дапаўняючы сказы ў тэксце патрэбнымі словамі.

… зацягнулі ўсё неба. Падзьмуў халодны … . Заблiскалі яркія … . Грымнуў … . На зямлю паліў … .

… схава́ліся пад лісце. … сцішыліся ў гнёздах.

Словы для даведкі: *жучкі, хмары, птушкі, вецер, дождж, маланкі, гром*.

Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Якую назву можна даць тэксту?

Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, — гэта **дзейнік**. Дзейнік адказвае на пытанне х т о? або ш т о?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**106.** З асобных слоў складзіце і запішыце прыказку. Чаму так гавораць?

курачка, зярнятку, па, збірае, бывае, сытая, і

Знайдзіце і падкрэсліце дзейнік у сказе адной рыскай.

**Завяжы вузялок!**

Дзейнік у сказе падкрэсліваецца адной рыскай: *З-за хмар выглянула* (ш т о?) *сонейка*.

**107.** Дапоўніце скорагаворкі патрэбнымі словамі. Назавіце ў сказах дзейнікі.

Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворкі.

Гучна г**а**г**а**талі [г..] г**а**м**а**нлівыя. В**о**ўкам вые [в..] ув**о**сень *(У. Мацвеенка)*.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце па памяці адзін сказ на выбар.

**108.** Прачытайце сказы. Выпішыце тыя з іх, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца дзейнікамі.

1. У парку дзеці ўбачылі прыгожыя **дубы**. На палянцы раслі магутныя **дубы**. 2. **Дрэвы** шумелі ад ветру. Каля дома дзядуля пасадзіў розныя **дрэвы**. 3. На зямлю падалі спелыя **жалуды**. Аленка збірала **жалуды** для вавёрачкі.

Падкрэсліце дзейнікі ў запісаных сказах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**109.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце. Падкрэсліце ў сказах дзейнікі.

1. З-пад травы ля самай сцежкі вызіраюць … . *(А. Зэкаў)*. 2. Галаўны́ шыкоўны ўбор дэманструе … . *(А. Зэкаў)*. 3. З-за бяроз, задраўшы шапкі, усміхаюцца … . *(А. Зэкаў)*. 4. Пад дубамі грыбнікі бралі ў кош … . *(У. Мацвеенка)*.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *баравікі, ababкі, сыраежкі, мухамор*.

**110.** Спішыце, дапаўняючы сказы патрэбнымі словамі.

Самалёт … у небе. Карабель … па моры. Аўтамабіль … па шашы. Чалавек … па сцежцы. Конь … па дарозе. Заяц … па полі.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *скача, бяжыць, ляціць, плыве, едзе, крочыць*.

Знайдзіце ў сказах дзейнікі і падкрэсліце іх адной рыскай. Што гаворыцца пра дзейнік у кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, — гэта **выказнік**. Выказнік адказвае на пытанні ш т о  р о б і ц ь? ш т о  р а б і ў? ш т о  б у д з е  р а б і ц ь? і інш.

Дзейнік і выказнік — **галоўныя члены сказа**.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**111.** Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у патрэбнай форме і запішыце іх. Падкрэсліце дзейнік у сказах адной рыскай, а выказнік — дзвюма.

1. Зоркі … на мароз. 2. Золата і ў смецці … .

Які са сказаў з’яўляецца прыказкай, а які — народнай прыметай? Растлумачце сэнс прыказкі.

**блішча́ць**

**Завяжы вузялок!**

Выказнік у сказе падкрэсліваецца дзвюма рыскамі: *Дзеці* (ш т о  р о б я ц ь?) *гуляюць на вуліцы.*

**112.** Прачытайце загадку-пытанне і адгадайце яе. Складзіце па пытанні апавядальны сказ, у якім дзейнікам будзе слова-адгадка.

Што вандруе ў канверце па ўсім свеце?




Запішыце сказ, падкрэсліце ў ім галоўныя члены.

**Рм** Разгледзьце паштоўкі. Якія сказы запісаны на іх? Перад якімі святамі дасылаюць кожную з гэтых паштовак?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**113.** Прачытайце тэкст. Чым уразілі вас паводзіны звяркоў?

## Па арэхі

Была сярэдзіна верасня. Дзьмуў лёгкі ветрык. З алешніку за вёскай даносіўся гаркаваты пах прывялай травы. Шарахцелі лістотай каля возера ляшчыны. На бераг каціліся хвалі з белымі грабянямі.



Янка збіраў у ляшчынніку арэхі. Раптам хлопчык убачыў у возеры дзвюх вавёрак. Звяркі выставілі з вады мордачкі. Пушыстыя хвосцікі ўзвышаліся над вадой, нібы сцяжкі. Вавёркі рухаліся ў бок ляшчынніку.

Янка здагадаўся, што звяркі плывуць з процілеглага берага, з сасонніку, па арэхі. Каб не спалохаць іх, хлопчык схаваўся за кустамі. А вавёркі выбраліся з вады ды скокнулі на ляшчыну *(Паводле Я. Галубовіча)*.

***ляшчы́на*** — *арэшына*

Знайдзіце і прачытайце тую частку тэксту, у якой змешчана апісанне незвычайных паводзін вавёрак. Выпішыце з кожнага прачытанага сказа галоўныя члены.

У з о р: *Янка збіраў.*

**Рм** Вусна перакажыце гэту частку тэксту з апорай на выпісаныя спалучэнні слоў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**114.** З прапанаваных частак складзіце прыказкі. Калі так гавораць?

| | |
|---|---|
| З малых крыніц | берагі падмывае. |
| Ціхая вада | вялікая рака нараджаецца. |

Назавіце ў кожнай прыказцы галоўныя члены сказа. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**115.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. У кожным сказе падкрэсліце дзейнік і выказнік.

1) б..розавы, асв..ціла, сонца, гай; 2) купаюцца, дрэвы, промнях, сонечных, у; 3) ветрык, лёгкі, пав..ва́е; 4) шамацяць, лісточкі, залатыя, б..розах, на.

Растлумачце правапіс прапушчаных літар.



**116.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

## Снег і апенькі

надоўга пасвятлела шэрае снежаньскае неба ўсталяваліся цёплыя сонечныя дзянькі згінулі маразы са стрэх закапалі буйныя кроплі ў лесе з'явіліся праталіны на пнях дружнымі сямейкамі выраслі апенькі *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Падкрэсліце ў кожным сказе дзейнік і выказнік.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Дададзеныя члены сказа

**117.** Прачытайце. Вусна вызначце ў сказах галоўныя члены. На якія дзве групы можна падзяліць сказы?

Прайшоў дождж. Увечары прайшоў дробны дождж. Шумелі дубы. На ўзлеску шумелі старыя дубы. Сонца ўзышло. Над лесам узышло яркае сонца.

Выпішыце сказы, у якіх, акрамя дзейніка і выказніка, ёсць іншыя словы. Падкрэсліце галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні ад дзейніка і выказніка да іншых слоў у сказе.

> Акрамя галоўных членаў, у сказе могуць быць **дададзеныя.**

**118.** Дапоўніце сказы дададзенымі членамі па пытаннях. Падкрэсліце ў сказах дзейнік і выказнік.

к а л і?                          к у д ы?
… пачнуцца канікулы. Надзейка пойдзе … .

ч ы я?         ш т о?
… бабуля ўжо купіла … .

д з е?
к а л і?       я к і м?
Дзяўчынка … не была ў … тэатры.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**С л о в ы   д л я   д а в е д к і:** *хутка, у тэатр, яе, білеты, даўно, лялечным.*

**Рм** Раскажыце, куды б вы хацелі трапіць у час асенніх канікулаў. Якія тэатры, музеі вы ўжо наведалі? Што вам там найбольш спадабалася?

**Даданыя члены сказа** паясняюць дзейнік, выказнік або іншыя даданыя члены сказа.

**119.** Прачытайце сказы. Назавіце ў іх галоўныя члены.




Лужыны пакрыліся за ноч лядком.




На беразе ракі стаялі вялікія дубы.




З вышыні даносіцца развітальны крык жураўлёў.

Вусна пастаўце па стрэлках пытанні да даданых членаў сказа. Зрабіце гэта ў той паслядоўнасці, якую падказваюць лічбы над стрэлкамі.

Выпішыце адзін сказ на выбар.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Завяжы вузялок!**

**Словы ў сказе звязаны па сэнсе. Каб устанавіць сувязь слоў у сказе, трэба ставіць пытанні ад аднаго слова да другога.**

**120.** З дапамогай малюнкаў дапоўніце сказы дададзенымі членамі па пытаннях.










1. Таня малюе (*к а г о?*) … . 2. Бабуля вяжа (*ш т о?*) … (*к а м у?*) … . 3. (*Я к а я?*) … дзяўчынка чытае (*ш т о?*) … . 4. Мама вязе (*к а г о?*) … (*к у д ы?*) … . 5. Дзед гуляе (*з к і м?*) … (*у ш т о?*) … . 6. (*К а л і?*) … сям'я сабралася (*д з е?*) … . 7. Тата працуе (*з а ч ы м?*) … . 8. Міша забівае (*ш т о?*) … .

Назавіце сказ, які адпавядае схеме.






Спампавана з сайта www.aversev.by

**121.** Прачытайце скорагаворкі. Назавіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў.

1. Катаецца ад рання кот на катамаране *(К. Камейша)*.

2. Круглыя сланечнікі ловяць цёплыя праменьчыкі *(С. Шах)*.

Запішыце сказ, які адпавядае схеме.






**122.** З асобных слоў складзіце па схемах прыказкі. Чаму так гавораць?

1) на, стаіць, праўдзе, свет




2) коле, вочы, праўда




Запішыце. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**123.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння сувязі слоў у сказе.

**1. Знаходзім у сказе … . Падкрэсліваем яго … .**

ш т о?

*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

**2. Ставім пытанне ад дзейніка да … . Падкрэсліваем выказнік … .**

ш т о з р а б і ў?

*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

**3. Па пытаннях знаходзім даданыя члены сказа, якія паясняюць … .**

я к і?

*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

**4. Па пытаннях знаходзім даданыя члены сказа, якія паясняюць … .**

к у д ы?

*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

Намалюйце схему сказа, разбор якога зрабілі.

Рм **124.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віталя Цвірко «Вечар». Па якіх прыметах можна здагадацца, што аўтар адлюстраваў асенні вечар? Якія фарбы пераважаюць на карціне? Які настрой яна стварае? Што знаходзіцца ў цэнтры карціны?



Спампавана з сайта www.aversev.by



План

1. Загарэліся зоркі.
2. Засынае рэчка.
3. Маўчаць дрэвы.
4. Выплыў месяц.

На аснове рэпрадукцыі карціны апішыце асенні вечар па плане.

Выкарыстайце наступныя словы і спалучэнні слоў: *загарэліся на небе, першыя зоркі; ціха цячэ; дрэвы, пільна ўглядаюцца, рачную гладзь; яны, губляюць там, сваю пазалоту; выплыў на неба; яго святло, накрывае лес, вёску над ракой*.

Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**125.** Прачытайце сказы. Вусна вызначце сувязь слоў у іх па пытаннях.

Учора вучні наведалі яе. Выстава знаёміць з творчасцю беларускіх мастакоў. Адкрылася новая выстава карцін.

Запішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы да іх.




**Рм** Раскажыце пра наведаныя вамі выставы.



**126.** Спішыце. Вусна вызначце сувязь слоў у сказах па пытаннях. Намалюйце схему выдзеленага сказа.

Паўлік добра малюе. **Хлопчык наведвае мастацкую школу.** Юны мастак удзельнічаў у міжнародным конкурсе. Ён атрымаў дыплом пераможцы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**127.** Дапоўніце сказы тэксту дадзенымі членамі, што паясняюць дзейнік.

я к і? … шар ляцеў над горадам. я к і я? … дзеці ў захапленні сачылі за ім. Іх цікавіла я к о е? … пытанне. Чаму лятае я к і? … шар? я к а я? … Даша запыталася пра гэта ў таты.



Словы для даведкі: *вялізны, паветраны, маленькія, важнае, цікаўная.*



***ціка́ўная*** — *дапытлівая*; рус. *любознательная*



Ці ведаеце вы, чаму лятае паветраны шар? Знайдзіце адказ у дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце. Выкарыстаўшы атрыманыя звесткі, складзіце працяг апавядання.

## Гаварыце правільна!

Цікавая кніга, ціка́ўная (дапы́тлівая) дзяўчынка, цікавіць пытанне, цікавіцца пытаннем, зацікавіцца пытаннем.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**128.** Прачытайце незаконченыя сказы. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго пісьмова.

калі? (→ …) адкуль? (→ …)

калі? (→ …)

… ішоў снег. … … выбеглі дзеці.

як? (→ …) каго? (→ …)

Яны … зляпілі … .

Словы для даведкі: *снегавіка, ноччу, дружна, раніцай, з пад’ездаў*.

**Рм** Што вы любіце рабіць, калі ідзе першы снег?

**129.** Прачытайце скорагаворкі.

1. Летам Тамара гербарый сабрала *(М. Пазнякоў)*. 2. Шуміць ля ракі чарот шапаткі́ *(М. Пазнякоў)*.

***шапаткі́*** — *шапатлівы*; рус. *шуршащий*

Назавіце сказ, які адпавядае схеме.

калі? што?

(д. ч.) ________ (д. ч.) ═══════ .



Спампавана з сайта www.aversev.by

Схема якога сказа не намалявана? Запішыце гэты сказ. Самастойна намалюйце яго схему.

Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць запісаную скорагаворку.

**130.** Складзіце прыказкі з асобных слоў па схемах. Чаму так гавораць?

я к о е?

1. (д. ч.) ________ ════════ .

добрае, не, забываецца, слова

н а ш т о?

2. (д. ч.) ════════ ________ .

знойдзецца, на, прыказка, усё

У якой з прыказак даданы член сказа паясняе дзейнік, а ў якой — выказнік?

Запішыце адну прыказку на выбар.



**131.** Прачытайце сказы. Запішыце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Прыдумайце назву тэксту.

Вучні хадзілі ў парк са сваёй настаўніцай. Усім спадабалася прагулка ў парк! Там яны каталіся на розных атракцыёнах. Дзяўчынкі набылі сабе рознакаляровыя шарыкі. Перад адыходам дадому



Спампавана з сайта www.aversev.by

дзеці частаваліся марожаным. Хлопчыкаў зацікавілі прыгожыя ліхтарыкі.

Знайдзіце ў тэксце сказ, які адпавядае схеме.




Падкрэсліце ў гэтым сказе дзейнік і выказнік.

## Адкажыце на пытанні

1. Якімі па мэце выказвання бываюць сказы?
2. Які сказ называецца апавядальным?
3. Які сказ называецца пытальным?
4. Які сказ называецца пабуджальным?
5. Які сказ называецца клічным?
6. Якія знакі прыпынку могуць стаяць у канцы апавядальнага і пабуджальнага сказаў?
7. Якія знакі прыпынку могуць стаяць у канцы пытальнага сказа?
8. Што такое дзейнік?
9. Што такое выказнік?
10. Што паясняюць даданыя члены сказа?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*



Спампавана з сайта www.aversev.by

# ЗНАЧЭННЕ СЛОВА

**132.** Разгледзьце схемы і скажыце, што мае кожнае слова.

| | | |
|---|---|---|
|  | будынак для жылля | дом |
| **прадмет** | **значэнне** | **слова** |
|  | рухацца ў паветры пры дапамозе крылаў | ляцець |
| **дзеянне** | **значэнне** | **слова** |
|  | светла-сіні, колеру яснага, чыстага неба | блакітны |
| **прымета** | **значэнне** | **слова** |

**?!** У якім слоўніку можна даведацца пра значэнне слова?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Завяжы вузлок!**

Кожнае слова мае **лексічнае значэнне.** Пра лексічнае значэнне слова можна даведацца ў **тлумачальным слоўніку.**

**133.** Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне.

Асілак, здарожыцца, гасцінны.

Параўнайце сваё тлумачэнне з тым, што даецца ў тлумачальным слоўніку.

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце іх.

1. Чалавек незвычайнай мужнасці і адвагі — гэта ... . 2. ... гаспадыня любіць прымаць і частаваць гасцей. 3. Дзядуля ... і вырашыў крыху адпачыць.

**134.** Прачытайце верш. Ці згодны вы з аўтарам? Адкажыце на пытанне ў назве верша. Прывядзіце свае прыклады такіх слоў.

### Якія бываюць словы?

Цёплыя словы — сонца і **хата.**
Лепшыя словы — **мама** і **тата.**
Смачныя словы — **хлеб** і **суніцы.**
Росныя словы — зоркі, крыніцы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Мудрыя словы — жыта і **поле**.
Светлыя словы — **вецер** і воля.
*Т. Мушынская.*

Значэнне якіх з выдзеленых слоў раскрываецца ніжэй?

1. Рух паветра ўздоўж зямлі. 2. Сялянскі дом. 3. Жанчына ў адносінах да сваіх дзяцей. 4. Харчовы прадукт, які выпякаецца з мукі. 5. Мужчына ў адносінах да сваіх дзяцей. 6. Участак зямлі, які апрацоўваецца для пасеву раслін. 7. Травяністая ягадная расліна з белымі кветкамі і пахучымі чырвонымі пладамі.

Запішыце чатыры словы на выбар разам з іх значэннем.

Узор: *Вецер — рух паветра ўздоўж зямлі.*

**135.** Прачытайце і запомніце прыказкі. Чаму так гавораць? З якімі словамі трэба звяртацца да людзей, каб не пакрыўдзіць іх?

Слова даражэйшае за золата. Слова не верабей: выпусціш — не зловіш.

Запішыце першую прыказку па памяці. Падкрэсліце ў ёй слова, значэнне якога раскрываецца ніжэй.

Адзінка мовы, якая служыць для называння асобнага паняцця.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**136.** Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Што іх аб'ядноўвае? Запішыце астатнія словы ў кожным радзе.

1) Дзядуля, бабуля, тата, мама, кот.
2) Васілёк, рамонак, ружа, пчала, дзьмухавец.
3) Кот, карова, мядзведзь, мёд, воўк.
4) Малаток, дрэва, сякера, піла, рубанак.
5) Аўтобус, трамвай, машына, цягнік, дарога.

## Адназначныя і мнагазначныя словы

**137.** Разгледзьце схемы і скажыце, колькі значэнняў маюць запісаныя словы. Патлумачце значэнне гэтых слоў.




Словы, якія маюць адно значэнне, называюцца **адназначнымі**. Словы, якія маюць некалькі значэнняў, называюцца **мнагазначнымі**.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**138.** Прачытайце словы. Знайдзіце іх значэнне ў тлумачальным слоўніку.

Ручнік, сервіз, ваза, маска, ружа, клетка.



Спішыце. Падкрэсліце адназначныя словы. Прыдумайце і запішыце два сказы з адназначнымі словамі.

**139.** Прачытайце словы. Патлумачце іх значэнне. У якой групе запісаны адназначныя словы, а ў якой — мнагазначныя? Дапоўніце кожны рад слоў. Выкарыстайце словы для даведкі.

1) Афіша, балерына, музыкант, гледачы, ..., ... .

2) Іголка, клас, зорка, пад’езд, ..., ... .

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *дзяўчынка, дошка, хлопчык, нос.*

Да якога слоўніка можна звярнуцца пры выкананні задання?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**140.** Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй? Назавіце сярод гэтых слоў мнагазначныя.

1) Гульня ў адказы на пытанні па адной тэме.

2) Лёгкая ежа паміж абедам і вячэрай. Перадвячэрні час.

3) Дождж з маланкай і громам.

4) Рознакаляровая дуга на небе, якая ўтвараецца ад праламлення сонечных прамянёў у кроплях дажджу.

5) Парадкавы лік прадмета. Асобны пакой у гасцініцы. Частка тэатральнага паказу, якая выконваецца асобна.

6) Песня, якую спяваюць над калыскай.

Словы для даведкі: *віктарына, навальніца, падвячорак, нумар, вясёлка, калыханка.*

Выпішыце адназначныя словы разам з іх значэннем.

Узор: *Віктарына — гульня ў адказы на пытанні па адной тэме.*



**141.** Прачытайце. Адкажыце на пытанне верша. Спішыце.





Вожык пад ёлкай
скакаў з Вавёркай.
Уся ў іголках
была Вавёрка.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Адкуль жа іголкі:
з Вожыка
ці з ёлкі?
*А. Зэкаў.*



Падкрэсліце мнагазначнае слова, якое сустрэлася ў вершы. Якія значэнні яно мае? У якім значэнні гэта слова ўжыта ў вершы?

## Прамое і пераноснае значэнне слова

**142.** Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы?

| | |
|---|---|
| Бабуля **выглянула** ў акно. | *паказалася* |
| Сонейка **выглянула** з-за хмар. | *паглядзела* |
| Тата **напаіў** дачушку малаком. | *паліў* |
| Дождж **напаіў** дрэвы і траву. | *даў папіць* |

Спішыце сказы, у якіх прыродныя з'явы апісваюцца вобразна. Дзякуючы якім словам ствараецца вобразнае апісанне?

Словы могуць ужывацца ў прамым і пераносным значэнні. **Прамое** значэнне слова з'яўляецца зыходным, асноўным. **Пераноснае** значэнне ўзнікае звычайна пры пераносе назвы з аднаго прадмета на другі на аснове іх падабенства.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**143.** Прачытайце тэкст. Якую мову можна назваць вобразнай?

## Вобразная мова

Людзі часта гаворацць вобразамі: дождж **ідзе**, рэчка **бяжыць**. Хоць усім вядома, што ні ў дажджу, ні ў рэчкі няма ног. «Вецер **вые**», — кажам мы і ўяўляем сабе вецер у вобразе жывой істоты. А пра сонейка, бывае, гаворым: «Сонейка **ўсміхаецца**». Сонейка не ўсміхаецца, гэта мы радасна ўсміхнуліся і **павесялелі**, калі яно **выглянула** з-за цёмнай хмары.

Кожнае слова тоіць у сабе не толькі назву рэчы або з'явы, у ім гучыць наша пачуццё *(Паводле В. Віткі)*.

У якім значэнні ўжыты ў сказах выдзеленыя словы?

Спішыце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту.

**144.** Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Падкрэсліце словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні.

Мама ... .
Сонейка ... .



Дзядуля ... .
Дождж ... .





Спампавана з сайта www.aversev.by

Ракета … .
Час … .



Вада … .
Работа … .



**145.** Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы?

**Паўзе** па небе цёмная хмара. **Бяжыць** да рэчкі чысты ручаёк. Журавіны чырвонымі шарыкамі **рассыпаліся** па балоце. **Танцуюць** над кветкамі прыгожыя матылькі.

Прыдумайце і запішыце сказы, у якіх гэтыя словы будуць ужывацца ў прамым значэнні.

**146.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Ля кусціка ракітнага —
вочка блакітнае.
Удзень да яго
сонейка спускаецца,
а ночкай —
месяц купаецца.

*У. Карызна.*




З чым параўноўваецца крыніца ў загадцы?

Запішыце другі сказ загадкі. Падкрэсліце ў ім словы, якія ўжыты ў пераносным значэнні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**147.** Прачытайце верш. Чаму ў хлопчыка цудоўны настрой?

## Цудоўны настрой

У мяне настрой цудоўны:
дождж скача, цёплы, спорны,
клапатлівы і ласкавы,
мые дрэвы, поіць травы.
Гром злуецца, дождж смяецца,
на маю кашулю льецца.

*Я. Крупенька.*



***спо́рны* — *часты***

Якія словы ў вершы робяць дождж падобным на чалавека? У прамым ці пераносным значэнні яны ўжыты?

Спішыце апошні сказ верша. Падкрэсліце ў ім словы, ужытыя ў пераносным значэнні.



**148.** Прачытайце. Выпішыце тыя спалучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

**Залатыя** рукі, **залатыя** завушніцы; **мяккі** хлеб, **мяккі** характар; **хвост** лісы, **хвост** цягніка; **цёплыя** словы, **цёплае** малако; **халодныя** вятры, **халодныя** фарбы; **светлы** дзень, **светлы** ўспамін; **гарачая** кава, **гарачая** пара́; **цвёрды** арэх, **цвёрдае** рашэнне.

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце і запішыце сказ.



Спампавана з сайта www.aversev.by

# Сінонімы

**149.** Разгледзьце малюнкі. Якімі словамі можна падпісаць кожны з іх?








Школьніца, трэніруецца, вясёлы, вучаніца, практыкуецца, радасны.

Запішыце словы парамі. Якое значэнне маюць словы ў парах?

Словы, якія маюць аднолькавае ці блізкае значэнне, называюцца **сінонімамі**.

**150.** Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае астатнія словы ў кожным радзе. Запішыце гэтыя словы.

Лес, бор, гай, дрэва, пушча.
Ісці, ступаць, стаяць, тупаць, крочыць.
Адважны, ціхі, смелы, мужны, храбры.

З двума словамі-сінонімамі прыдумайце і запішыце сказы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**151.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце і запішыце слова-адгадку. Падбярыце да адгадкі сінонім і запішыце яго.

а г й у л т ь

У яго адны турботы:
адвільнуць як ад работы.
Бесправбудна суткі спіць
ды яшчэ пра гэта сніць.

*У. Паўлаў.*

Выберыце са слоў для даведкі сінонімы да выдзеленага слова і запішыце іх.

Словы для даведкі: *храбрэц, **работнік**, лянівец, працаўнік, смяльчак, супрацоўнік, герой.*

**152.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Калі здолееш узяцца за справу — і снег **загарыцца**, не здолееш — і масла не **ўспыхне.**

Спішыце. Як называюцца выдзеленыя словы?

**153.** Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце выдзеленыя словы сінонімамі.

**Смелы** чалавек, сасновы **лес**, хутка **крочыць**, **гоман** лесу, сапраўдны **смяльчак.**

Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. З адным з іх на выбар вусна складзіце сказ.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**154.** Падбярыце да слоў з піраміды сінонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | л | е | с | * | * | * | | | |
| | | г | о | р | а | * | * | * | * | | |
| | м | а | р | о | з | * | * | * | * | * | |
| д | р | ы | г | в | а́ | * | * | * | * | * | * |

Запішыце словы парамі. З адной парай слоў на выбар складзіце і запішыце сказы.



**155.** Спішыце. Знайдзіце ў вершы сінонімы і падкрэсліце іх.

Раптам гоман сціх,
і смех
змоўк у момант нейкі —
паваліў пушысты снег.
Аж казыча вейкі.

*У. Паўлаў.*



***казы́ча*** — рус. *щекочет*

Выпішыце з верша блізкія па значэнні словы да прапанаваных.

Шум — ..., пасыпаў — ..., пухкі — ..., імгненне — ... .



Спампавана з сайта www.aversev.by

# Антонімы

**156.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце пытанні. Дапоўніце кароткія адказы на іх патрэбнымі словамі.



Якога колеру шахматныя фігуры? Белыя і … .



Якога памеру бываюць сабакі? Вялікія і … .



Які настрой бывае ў дажджлівы дзень? Сумны і … .

Запішыце адказы на пытанні. Знайдзіце і падкрэсліце ў іх супрацьлеглыя па значэнні словы.

Словы з супрацьлеглым значэннем называюцца **антонімамі.**

**157.** Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы да прапанаваных. Запішыце антонімы парамі.

**Шчасце — бяда**, лета — …, блізка — …, многа — …, добры — …, доўгі — …, малы — …, мяккі — …, вайна — …, сцюжа — … .



Спампавана з сайта www.aversev.by

Дапоўніце прыказкі выдзеленымі словамі.

**шча́сце**

... усюды, дзе захочаш.
... хоць мучыць, але жыць вучыць.

**158.** Прачытайце загадку. З літар, што «схаваліся» на малюнках, складзіце адгадкі-антонімы.

Абедзве часта нас даймаюць,
шукаць ратунку прымушаюць.
Адна з іх **летам** узнікае,
штора́з купацца заклікае.
Калі яна мацнее ўдзень,
імкнёмся мы схавацца ў цень.

жсцюа

Другая — холадам **сцюдзёным**
**зімой** завітвае да нас,
пад стрэхі вераб'ёў заганіць,
дыханнем **ледзяным** абдасць.

аспёк

*М. Пазнякоў.*

Якія з выдзеленых слоў блізкія па значэнні, а якія — супрацьлеглыя?

## Гаварыце правільна!

**Два** хлопчыкі, **абодва** хлопчыкі, **дзве** дзяўчынкі, **абедзве** дзяўчынкі.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**159.** Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

**Увосень** плача, хто … скача. На **чорным** полі … пшаніца родзіць. **Летнюю** часіну … тыднем не заменіш.

Словы для даведкі: *белая, увесну, зімовым.*

**160.** Прачытайце. Вызначце прымету, па якой словы кожнага рада аб'яднаны ў пары. Падбярыце і дапішыце пары да кожнага выдзеленага слова.

1) Белы — чорны, зіма — лета, **цёмны** — …, **цёплы** — …, **раніца** — …, **сесці** — … .
2) Гоман — шум, загадкавы — таямнічы, **дзіва** — …, **баязлівы** — …, **грэбень** — …, **сустрэца** — … .

Словы для даведкі: *светлы, спаткацца, халодны, расчоска, вечар, нясмелы, устаць, цуд.*

**161.** Да выдзеленых слоў падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| **свежы** хлеб | *пракіслае* |
| **свежае** малако | *чэрствы* |



Спампавана з сайта www.aversev.by

| | |
|---|---|
| **свежая** газета | *цёплы* |
| **свежы** вецер | *старая* |

Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры.

Узор: *свежы хлеб — чэрствы хлеб*.

З двума спалучэннямі слоў на выбар вусна складзіце сказы.

**Гаварыце правільна!**

**[С']вежы, [с']ветлы, [с']вітанне, [с']цюжа, [с']пёка, шча[с']це, га[с']цінец.**



**162.** Падбярыце і запішыце антонімы, якія характарызуюць:

*час*: змяркание — світанне, восень — ..., рана — ...;

*прастору*: далёкі — блізкі, высокі — ..., шырокі — ...;

*якасці*: брудны — чысты, дрэнны — ..., шкодны — ...;

*рысы характару*: маўклівы — гаварлівы, вясёлы — ..., смелы — ...;

*колер*: светлы — цёмны, белы — ...;

*напрамкі свету*: поўдзень — поўнач, усход — ... .

З адной парай антонімаў вусна складзіце сказы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні

**163.** Разгледзьце малюнкі. Як па-руску называюцца прадметы і з’явы, адлюстраваныя на іх?













Дыван, канапа, гарбуз, кавун, качка, гайда́нка.

Якімі беларускімі словамі можна падпісаць кожны з малюнкаў?

**?!** Чаму трэба быць уважлівымі пры выкарыстанні гэтых слоў?

Вусна складзіце сказы з гэтымі словамі.

**Завяжы вузялок!**

У беларускай і рускай мовах ёсць словы, падобныя або аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**164.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Запішыце два сказы на выбар.

1) Вадаплаўная птушка з шырокай дзюбай, кароткай шыяй і кароткімі лапамі — гэта ... .
2) Гайданне судна пры хваляванні мора — гэта ... .
3) Гладкая бліскучая паверхня, здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёй — гэта ... .
4) Асобнае памяшканне для жылля ў кватэры, доме — гэта ... .

люстра

качка

гайда́нка

пакой

## Будзьце ўважлівыя!

| у беларускай мове | у рускай мове |
|---|---|
| рэч | вещь |
| мова | речь |
| качка | утка |
| гайданка | качка |
| справа | дело |
| гасцінец | дорога |
| благі | плохой |
| добры | благой (хороший) |
| пакой | комната |
| спакой | покой |



Спампавана з сайта www.aversev.by

**165.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Падарунак сябруку
служыць назвай бальшаку.
*У. Мазго.*



Запішыце загадку разам з адгадкай.

**166.** Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.

... — ласунак, які госць або блізкі падносіць у падарунак гаспадарам.

... — вялікая бойкая дарога, звычайна абсаджаная дрэвамі.

*гасці́нец*

**167.** Дапішыце па аднаму слову ў кожную групу сінонімаў.

1) Дарога, шлях, бальшак, ...; 2) падарунак, дарунак, дар, ... .



**168.** Прачытайце верш. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны?

Чаравічкі ў нашай Славы —
адзін левы, другі правы.
Справа — левы,
злева — правы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

— Скажы, Слава,
у чым справа?
— Тут маёй няма віны:
паспрачаліся яны.

*А. Пысін.*

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія аднолькава вымаўляюцца і пішуцца, але маюць рознае значэнне. Выпішыце з тэксту антонімы.

**169.** Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Запішыце сказы, у якіх словы ўжываюцца ў пераносным значэнні.

Дзяўчынкі ... на сцэне.
Сняжынкі ... у паветры.





Ёлка ... агнямі.
Агонь ... у каміне.

**170.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх сінонімы.

Рыхтавацца, збірацца, небывалы, гатавацца, ласункі, упрыгожваць, убіраць, прысмакі, незвычайны, неверагодны, аздабляць, дзіўны.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**171.** Падбярыце да слоў з піраміды антонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | я | в | а | с | о | * | | | |
| | | л | е | т | а | з | * | * | * | | |
| | с | п | ё | к | а | с | * | * | * | * | |
| б | л | а | г | о | е | д | * | * | * | * | * |

Рм **172.** Прачытайце назву тэксту і яго пачатак.

## Новы год — цудоўнае свята

Палінка і Петрык вельмі любяць Новы год. Яны пачынаюць рыхтавацца да свята загадзя...

Разгледзьце малюнак. Пазнаёмцеся з планам тэксту.





Спампавана з сайта www.aversev.by

План

1. Упрыгожванне пакоя.
2. Аздабленне ёлкі.
3. Лісты Дзеду Марозу.
4. Паштоўкі для бабулі і дзядулі.
5. Падарункі для таты і мамы сваімі рукамі.

Складзіце працяг апавядання пра падрыхтоўку да Новага года ў сям'і Палінкі і Петрыка. Карыстайцеся словамі з практыкаванняў 170—171.

Складзіце вуснае паведамленне пра тое, як рыхтуюцца да навагодняга свята ў вашай сям'і.



**173.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Для гэтага перакладзіце прапанаваныя рускія словы на беларускую мову.

[утка]

1. … адплыла ад берага. На моры пачалася

[качка]

… .

[комната]

2. Міколка прыбраў свой … . Хвораму

[покой]

чалавеку патрэбен … .

[речь]

3. … вучня была дакладнай і правільнай.

[вещь]

Кожная … ляжыць на сваім месцы.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Адкажыце на пытанні

1. У якім слоўніку можна даведацца пра лексічнае значэнне слова?
2. Якія словы называюцца адназначнымі?
3. Якія словы называюцца мнагазначнымі?
4. Якое значэнне слова называецца прамым?
5. Як узнікае пераноснае значэнне слова?
6. Што такое сінонімы?
7. Што такое антонімы?
8. Якое значэнне маюць у беларускай мове словы *рэч, пакой, гасцінец*?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці?*

*Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*

Спампавана з сайта www.aversev.by

# СКЛАД СЛОВА

**Успомніце**

З чаго складаецца слова?
Назавіце склады, гукі і літары ў слове *радасць*.

## Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова

**174.** Прачытайце.

| | | |
|---|---|---|
| радасць | радок | радасць |
| весялосць | радыё | радасны |
| уцеха | радасць | радаваць |

Як называюцца словы першага слупка? Чаму? Што агульнае ў словах другога слупка? Ці звязаны яны па значэнні?

**?!** Што аб'ядноўвае словы трэцяга слупка? Запішыце іх. Дапоўніце запіс уласным прыкладам.

**Завяжы вузялок!**

Словы з аднолькавай часткай, у якой заключаецца асноўнае для іх лексічнае значэнне, называюцца **роднаснымі.**



Спампавана з сайта www.aversev.by

**175.** Прачытайце верш. Хто ўваходзіць у гусіную сям'ю? Якую добрую справу зрабілі гусі?

## Качаняты

Ходзяць гусі ланцужком:
гусачкі — за гусаком,
а за імі — гусяняты
і малыя качаняты.
Прытуліла, як свая,
іх гусіная сям'я.

*З. Марозаў.*

Спішыце. Знайдзіце ў вершы роднасныя словы, абазначце ў іх знакам ⌒ агульную частку.

> Агульная частка роднасных слоў, якая выражае іх асноўнае лексічнае значэнне, — гэта **корань**. Роднасныя словы называюцца **аднакаранёвымі.**

**176.** Прачытайце. У кожным радзе слоў знайдзіце лішняе. Растлумачце свой выбар.

Качка, качаня, качы́ная, качэлі.
Галубка, галубятня, прыгалубіць, галубяня́.
Сава, саветнік, саві́ны, савяня́.

Запішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**177.** Разгледзьце «дрэва» аднакаранёвых слоў. Які корань яны маюць? Растлумачце значэнне кожнага слова.






Намалюйце сваё «дрэва» аднакаранёвых слоў з коранем *-зуб-* або *-грыб-*.

Растлумачце значэнне аднакаранёвых слоў. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам.

**178.** Прачытайце тэкст. Чым вас уразілі паводзіны буслоў? Чаму можна ў іх павучыцца людзям?

## Не пакінулі ў бядзе

На старую вольху прыляцелі **буслы.** Над вёскай пачуўся **птушыны** клёкат.

Вечарам усхадзіўся вецер. Цэлую ноч стагнала, рыпела старая вольха. Пад **раніцу** ў дрэва зламалася верхавіна. Яна ўпала на зямлю разам з **буслянкай.**

**Ура́нку** над зламанай вольхай ужо кружылася пяць пар буслоў. Яны дружна пачалі майстраваць новае **гняздо** на гумне. **Птушкі** насілі на дах галінкі, мох.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Праз дзень буслы работу закончылі. **Памочнікі** развітальна пакружыліся над гумном. **Гаспадары** засталіся.

Зноў вёску радаваў **буслíны** клёкат *(Паводле Я. Галубовіча)*.

***гумнó*** *— гаспадарчая пабудова, у якой сушаць снапы, малоцяць збожжа*

Падзяліце тэкст на часткі і складзіце яго план.

Якімі словамі аўтар называе ў тэксце буслоў? Сярод выдзеленых слоў знайдзіце і выпішыце аднакаранёвыя. Выдзеліце ў іх корань, растлумачце значэнне.

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане, выкарыстоўваючы запісаныя аднакаранёвыя словы.

**179.** Адгадайце загадку. Спішыце.



**Хто зімы не баіцца?**

Убор у птушкі яркі.
Яна ад снежнай хмаркі
не адляцела ў вырай,
а дома, тут, дзе вырасла,
перазімуе зімку
з завеяй у абдымку.

*Л. Багдановіч.*

Знайдзіце ў загадцы аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. Падбярыце да іх іншыя аднакаранёвыя словы і запішыце.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Запішыце слова-адгадку. Ці ведаеце вы, адкуль у птушкі такая назва? Знайдзіце адказ на гэта пытанне ў дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.

**180.** Прачытайце. Вызначце націскныя склады ў словах. Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

н..с — н..саты  
д..м — д..мок  
к..т — к..ток  
ц..гла — ц..гля́ны  
стр..́льба — стр..ляць  
ш..пт — ш..птаць

Абазначце корань у словах. Якія змены адбыліся ў корані слоў? Чаму?

**Завяжы вузялок!**

**Пры ўтварэнні і змяненні слоў можа адбывацца змена гукаў (чаргаванне). Часцей за ўсё чаргаванне сустракаецца ў каранях слоў: *горад — гарадок, рэчка — рачны, кот — кацяня, снег — сняжок, слёзы — сляза, хадá — хадзіць.***

**181.** Спішыце сказы. Устаўце ў словы літары ***е, ё*** або ***я***, растлумачце іх правапіс.





В..́рбная нядзеля, або В..́рбніца, — адно з любімых свят беларусаў. Галоўныя народныя абрады в..рбнага тыдня звязаны з в..рбой.

Абазначце корань у аднакаранёвых словах.

**Рм** Раскажыце, што вы ведаеце пра Вербную нядзелю.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**182.** Змяніце прапанаваныя спалучэнні слоў па ўзоры. Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах. Растлумачце правапіс галосных у корані аднакаранёвых слоў.

**Марскі** бераг — бераг **мора,**
**гарадскі** стадыён — стадыён ...,
**горная вяршыня** — вяршыня ...,
**кляновы** ліст — ліст ...,
**вясковыя** жыхары — жыхары ...,
**нябесны колер** — колер ... .

Складзіце два сказы з той парай спалучэнняў слоў, у якой сустракаецца слоўнікавае слова.

***гарадскі́***

**183.** Прачытайце словы з правага слупка. Якія літары трэба ўставіць у іх?

**Поля ў полі**
ля таполі
сіні лён
ад ранку **поле.**
*У. Мацвеенка.*

*п...лявы*
*П...ліна*
*прап...лоць*

Прачытайце скорагаворку. Што абазначаюць выдзеленыя словы? Падбярыце да выдзеленых слоў аднакаранёвыя з правага слупка. Запішыце аднакаранёвыя словы парамі, выдзеліце ў іх корань.

Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**184.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць іх. Якія літары трэба ўставіць у словы замест пропускаў?

1. Марына марынавала моркаўку. Марынавала — не замарынавала, толькі марынад змарнавала.
2. Ц..це́ра цераз бор ляцела, ц..церука́ з ц..церучанятамі знайсці хацела *(Н. Несцяронак)*.

***змарнава́ла** — дарэмна патраціла*

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. Якое слова са скорагаворак з'яўляецца аднакаранёвым да слоў *баравы́, баравік*?

Выканайце заданне з электроннага дапаможніка.

**185.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Колас, што з..рнят не мае, угору лоб задзірае.
Адно з..́рне пуды́ прыносіць.
Калі хочаш хлеб мець, трэба з..млі́цу гл..дзець.

***пуд** — старажытная мера вагі, роўная 16 кг*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.
Знайдзіце ў прыказках аднакаранёвыя словы, выдзеліце ў іх корань.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**186.** Прачытайце словы ў слупках. Па якой прымеце яны аб'яднаны ў групы? Размяркуйце словы на групы па іншай прымеце і запішыце.

| | | |
|---|---|---|
| свет | хадавы | свяціць |
| хадок | светлы | халадзіць |
| халады | халодны | хадзіць |
| палёт | лётны | ляціць |

Як называюцца словы кожнай запісанай групы? Выдзеліце ў іх корань. Якія змены адбыліся ў корані слоў? Чаму?

***свяціць***

**187.** Прачытайце і адгадайце загадку.



**Хто вінаваты?**

У бабулі нехта ранкам
з'еў са сподачка смятанку.
У каго ў смятане рот?
Ну вядома ж, гэта … .

*М. Маскевіч.*

Выпішыце з загадкі аднакаранёвыя словы, дапоўніце іх сваім прыкладам. Выдзеліце ў іх корань.

Падбярыце і запішыце аднакаранёвыя словы да слова-адгадкі. Патлумачце змены, якія адбыліся ў корані гэтых аднакаранёвых слоў.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**188.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння кораня ў слове *смятана*.

**1. Падбіраем да слова ... .**
*Смятана — смятанка, смятанны, смятаннік.*
**2. Выдзяляем у словах ... .**
*Смятана, смятанка, смятанны, смятаннік.*
**3. Памятаем, што пры ўтварэнні і змяненні слоў у корані можа адбывацца ... .**
*Смятана — сметанковы.*
**4. Абазначаем корань у слове ... .**
*Смятана.*

**189.** Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку? Чаму так разважала дзяўчынка? Хто гатуе розныя стравы ў гэтай сям'і?

## Чыя кухня?

Сашка, маці, тата і бабуля сядзяць на кухні.

— Гэта кухня мая, матуліна і бабуліна, — тлумачыць дачушка Сашка.

— А мая? — цікавіцца татка.

— Кухня не твая, — адказвае дачка.

— А што ж тады маё?

— Твая — канапа *(Паводле А. Зэкава)*.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы парамі. Выдзеліце ў іх корань. У якіх аднакаранёвых словах адбыліся змены ў корані? Растлумачце правапіс ***т—ц*** у іх.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**190.** Падбярыце аднакаранёвыя словы па ўзоры. Выдзеліце ў іх корань. Растлумачце правапіс ***д—дз*** у іх.

*лёд — ледзяны́*
вада — …

*каманда — камандзір*
брыгада — …

*садок — садзіць*
халадок — …

*вуда — вудзіць*
крыўда — …

*малады — маладзіць*
салодкі — …



**191.** Прачытайце апавяданне. Чым зацікавіў дзядуля ўнука?

## Казкі пра зоркі

**Дзед** часта расказваў мне, **малому**, казкі пра **зоркі.** Мы сядзелі вечарам каля хаты, і дзядуля паказваў на **зорнае** неба.

— Бачыш, унучак, Вялікую Мядзведзіцу? Яна падобна на **чарпак,** якім мы **чэрпаем** ваду з вядра.



А я пры гэтым уяўляў **мядзведзіцу,** якая ахоўвае сваіх **маленькіх медзведзянят.** Вунь іх колькі рассыпана па зорным шатры! *(Паводле М. Даніленкі).*

Сярод выдзеленых слоў знайдзіце і выпішыце аднакаранёвыя.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Працягніце рад аднакаранёвым словам з тэксту.

Водны, вадзіца, ... .

Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах. Растлумачце змены літар у корані.

**Завяжы вузялок!**

Некаторыя чаргаванні гукаў у корані слоў можна растлумачыць, звярнуўшыся да гісторыі развіцця нашай мовы. Такія чаргаванні называюць гістарычнымі: *дарога — дарожны — на дарозе; гарох — гарошак — у гаросе; вязаць — вяжу; рука — ручка — у руцэ.*

**192.** Утварыце аднакаранёвыя словы па ўзоры.

| | | |
|---|---|---|
| *луг — лужок* | *муха — мушка* | *рак — рачок* |
| стог — ... | вуха — ... | крук — ... |
| пірог — ... | чарапаха — ... | сук — ... |

Выдзеліце корань у словах. Назавіце гукі, якія змяніліся ў каранях слоў. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**Гаварыце правільна!**

Цвітуць на **лу́зе**, схаваўся ў **стозе**, сплёў **му́се** сетку.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**193.** Прачытайце словы. Што аб'ядноўвае іх?

Павуціна, павук, павучок, павуцінка.

Запішыце словы ў тым парадку, у якім указаны іх значэнні.

1. Жывёліна, якая пляце павуціну.
2. Сетка з тонкіх нітак або асобная тонкая нітка, утвораная з клейкага рэчыва, якое выдзяляецца павуком.
3. Маленькая павуціна.
4. Невялікі павук.

***паву́к***

Выдзеліце корань у словах. Назавіце гукі, якія змяніліся ў каранях слоў. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**194.** Дапоўніце народную прымету слоўнікавым словам і запішыце яе.

... плятуць шмат павуціння — будзе **сухое** і **халоднае** надвор'е.

Абазначце корань у выдзеленых словах. Вусна падбярыце да іх аднакаранёвыя. Назавіце гукі, якія змяніліся ў каранях слоў.

**195.** Прачытайце загадку. Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары і назавіце слова-адгадку. Растлумачце правапіс прапушчаных літар у словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Каля ракіты б..ражкі
Ручай трымаюць гаваркі.
А па баках па макраце
П..кучая яна расце.
І хоць не горш за іншых кв..так
В..сны абуджанай прымета,
А дакранешся — ап..чэ.

*У. Мацвеенка.*



Выпішыце з загадкі аднакаранёвыя словы да прапанаваных.

берaг — ...
печ — ..., ...
веснавы — ...
квяцісты — ...

Выдзеліце корань у словах.



Пра якія карысныя якасці крапівы вы можаце расказаць? Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў кнізе «Энцыклапедыя прыроды Беларусі», у дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.

**196.** Прачытайце тэкст. Дзе будуюць свае гнёзды гракі, буслы, берагавыя ластаўкі?

## Дзе чыё гняздо

**Грачыныя гнёзды** нагадваюць кучкі галля. Калі на дрэвах зелянее лісце, гнёзды **гракоў** цяжка заўважыць.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**Буслянкі** можна ўбачыць на дрэвах, дахах дамоў, на слупах. Побач з **бусламі** часта ладзяць свае **гняздзечкі** вераб'і.

Берагавыя ластаўкі майструюць свае гнёзды ў глыбокіх норах. Гэтыя птушкі жывуць на пясчаных абрывістых берагах **рэк**. Яны на ляту ловяць мошак над **рачной** вадой.

Сярод выдзеленых слоў знайдзіце аднакаранёвыя. Запішыце кожную групу аднакаранёвых слоў з новага радка.

Выдзеліце ў словах корань. Назавіце гукі, якія змяніліся ў каранях слоў. Падкрэсліце адпаведныя літары.



Раскажыце пра незвычайныя гнёзды птушак Беларусі. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў кнізе «Энцыклапедыя прыроды Беларусі» або ў інтэрнэце.



**197.** Прачытайце верш. Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

## Павучок

Намалюю я кар(*т/ц*)іну:
павучка і паву(*т/ц*)іну.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Сплёў на славу ён узор,
сам схаваўся — і замёр.
Доўга бу*(д/дз)*е так ся*(д/дз)*ець.
Не пушчу я мушку ў се*(т/ц)*ь.

*Г. Каржанеўская.*

Знайдзіце ў першым сказе аднакаранёвыя словы, абазначце ў іх корань. Назавіце гукі, якія змяніліся ў корані слова. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**Успомніце**

Якія пары ўтвараюць звонкія і глухія зычныя ў беларускай мове?

Калі трэба правяраць правапіс слоў з парнымі звонкімі-глухімі зычнымі?

**198.** Прачытайце. Які гук абазначаюць у словах выдзеленыя літары? У якіх словах напісанне выдзеленых літар трэба правяраць? Якія словы з'яўляюцца праверачнымі?

ледзь — лебедзяня — лебядзіны
мы**ш**ка — мы**ш** — мы**ш**аня
ву**з**кі — ву**з**енькі — ву**з**ець
адлё**т** — паралё**т** —палё**т**ы

Спішыце. Абазначце корань у аднакаранёвых словах. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**199.** Прачытайце словы. Якія літары трэба ўставіць у словы? Падбярыце да прапанаваных слоў праверачныя аднакаранёвыя словы.

| | |
|---|---|
| зага*(д/т)*ка — … | лу*(г/х)* — … |
| дзя*(дз/ц)*ька — … | прыка*(з/с)*ка — … |
| ко*(ж/ш)* — … | дож*(дж/ч)* — … |

Запішыце словы парамі. Выдзеліце ў іх корань.

**200.** Прачытайце тэкст. Якая радасная падзея здарылася ў Дзяніскі? Кім хлопчык марыць стаць у будучым? Чаму вы так вырашылі?

### Маленькі мара́к

Учора ў Дзяніскі было сапраўднае свята. Дзед Міхась прывёз яму ў падарунак афіцэрскую фуражку. Бінокль і цяльняшка ў Дзяніскі ўжо ёсць. Мама купіла нават штонікі з якарам. А вось пра капітанскую фуражку хлопчык марыў даўно. Яе падарыў дзеду даўні сябар. Ён шмат гадоў служыў капітанам на акіянскім караблі *(Паводле Т. Мушынскай)*.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да прапанаваных.

у Дзяніса — …
дзядуля, дзядок — …
Міхасёк — …



Спампавана з сайта www.aversev.by

Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць. Назавіце праверачныя словы.

**Рм** Якія прафесіі падабаюцца вам? Што вы можаце расказаць пра заняткі людзей гэтых прафесій?

**201.** Прачытайце верш. Як трэба пачынаць дзень? Для чаго трэба бегаць, рабіць зарадку?

Прыйдзе ранак,
мы — пад душ.
Не даймае
спёка й суш!

Перад тым у нас —
прабежка
лугам, потым
лесу ўзмежкам.

Дзе прабежка —
там усмешка.

*Т. Мушынская.*



Назавіце ў вершы словы, напісанне якіх трэба правяраць. Выберыце з прапанаваных слоў тыя, якія могуць быць праверачнымі.

Душа́, душавы; сушыць, суша; бяжыць, бэжавы; міжнародны, ме́жы; смяшынка, мяшаць.

Запішыце правяраемае слова разам з праверачным. Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

***бэ́жавы*** — рус. *бе́жевый*
***узме́жак*** — тут: *вузкая незасеяная палоска поля па краі лесу*

**202.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

**Горкая часам праца**, ды **хле..** ад яе **сало..кі.**

Вызначце корань у выдзеленых словах. Якія літары трэба ўставіць у словы замест пропускаў? Чаму?

Запішыце прыказку па памяці.

Выканайце заданне з электроннага дапаможніка.

**203.** Спішыце сказы. Устаўце ў словы патрэбныя літары. У дужках запішыце праверачныя аднакаранёвыя словы.

1. У бабулі каля хаты пасуцца маленькія ко*(з/с)*кі (...). Матуля запляла дачушцы доўгія ко*(з/с)*кі (...).
2. Андрэй убачыў, як суседскі ко*(д/т)* (...) ловіць рыбу ў сажалцы. Каб адчыніць дзверы, трэба набраць на замку спецыяльны ко*(д/т)* (...).
3. Лі*(з/с)*ка (...) любіць слухаць, як дзядуля расказвае казкі. Хітрая лі*(з/с)*ка (...) уцякла ад паляўнічага сабакі.

Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Формы слова. Канчатак

**204.** Прачытайце тэкст. Выдзеленыя словы маюць адно лексічнае значэнне ці розныя? Што абазначае гэта слова?

У лесе расце прыгожая **сасна**. Да **сасны** прыхілілася бярозка. На **сасне** ў дупле знайшлі сабе прытулак вавёркі. Пад **сасной** зрабіў норку вожык.

У навальніцу злосны вецер налятае на **сасну**. Але **сасне** гэта не шкодзіць. Моцна трымаецца яна за зямлю сваім карэннем.

Выпішыце выдзеленыя словы ў слупок. Выдзеліце ў іх зменную частку знакам □.

Узор: *сасн*[*а*]

...

**Завяжы вузялок!**

Пры змяненні слова ўтвараюцца формы гэтага ж слова, яго лексічнае значэнне не змяняецца: *рас*[*а*], *рас*[*е*], *рас*[*ы*], *рас*[*ой*].

**205.** Параўнайце словы ў групах. У якой групе запісаны аднакаранёвыя словы, а ў якой — формы аднаго і таго ж слова?

| | |
|---|---|
| праўда, праўдзівы<br>апраўдаць, апраўданне | праўда, праўдай<br>праўды, праўдзе |

Выпішыце аднакаранёвыя словы. Абазначце ў іх корань.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**206.** Спішыце прыказкі, раскрываючы дужкі. Чаму так гавораць?

*(Праўда)* даражэйшая за грошы. *(Праўда)* найдалей дойдзеш. *(Праўда)* у я́му схаваеш, а сам з ямы не вылезеш. На *(праўда)* свет стаіць.

Што вы зрабілі са словам *праўда*, каб звязаць словы прыказак паміж сабой? Выдзеліце ў сказах зменную частку слова *праўда* знакам □.

Зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе, — гэта **канчатак**. Канчатак утварае **форму слова**.

**207.** Прачытайце. Якую добрую справу робіць хлопчык? Для чаго трэба садзіць дрэвы?



## Вішанька

Сонейка ласкавае
саграе зямлю.
Я саджу за хатаю
**вішаньку** сваю.
Будзем разам з **вішанькай**
мы цяпер расці
і сябрамі **добрымі**
будзем у жыцці.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Вішнямі** парадуе
**вішанька** мая,
ну а **добрай** справаю —
тату з мамай я.
*М. Пазнякоў.*

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца формамі аднаго і таго ж слова? Выпішыце іх у два слупкі і абазначце канчаткі.

**208.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, канчаткі ў словах.

1) на, дрэва, галінка, сеў, прыгожая, матылёк;
2) яго, у, былі, шырокі, крылы;
3) яны, на, пераліваліся, сонейка.

Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Дакажыце.



**209.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

**Жук** пытаецца ў **жука**:
— Ты чаму без **пінжака**?
— Я памыў свой **пінжачок**
і павесіў на сучок.
*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца формамі аднаго і таго ж слова? Абазначце ў іх канчаткі.

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца аднакаранёвымі словамі? Абазначце ў іх корань.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**210.** Прачытайце. Змяніце сказы па ўзоры і запішыце. У чым падабенства і адрозненне кожнай пары сказаў?

Шуміць жытнёвае поле. — Шумяць жытнёвыя палі.
Зелянее маладая бяроза. — …
Танцуе маленькая дзяўчынка. — …

Выдзеліце ў словах канчаткі.

**211.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння канчатка ў слове *дрэва*.

**1. Змяняем … .**
*Дрэва — дрэвы, дрэву, дрэвам, па дрэве.*
**2. Знаходзім у формах слова … .**
*Дрэва, дрэвы, дрэву, дрэвам, па дрэве.*
**3. Абазначаем … .**
*Дрэва* .

**212.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Добр**ая** слав**а** людз**ей** збіра**е**, дрэнн**ая** — разганя**е**.
Добрая слава даражэйшая за багацце.

Дакажыце, што ў словах першай прыказкі выдзелены канчаткі.

Запішыце другую прыказку па памяці. Выдзеліце канчаткі ў словах. Ці змаглі вы выдзеліць канчатак у прыназоўніку? Чаму?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Завяжы вузялок!**

Прыназоўнікі не маюць канчаткаў, таму што яны не змяняюцца.

**213.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, канчаткі ў словах. Выдзеліце канчаткі ў тых словах, якія змянілі.

1) прыгравае, сонейка, майскі;
2) свішчуць, на, бярозы, шпакі;
3) раптам, загучалі, трэлі, прыгожае, птушынае;
4) гэта, заспявала, жаваранкі;
5) цудоўны, пакацілася, мелодыя, за, узлесак.

Ці можна назваць гэтыя сказы тэкстам? Дакажыце.

**214.** Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожным радзе? Запішыце гэтыя словы.

1) прыгожы, прыгожая, прыгажуня, прыгожыя;
2) колас, каласок, каласіцца, каласы;
3) ходзіць, ходзяць, ходзіш, паходка;
4) птушаня, птушкі, птушка, птушкам.

Абазначце корань у аднакаранёвых словах. Выдзеліце канчаткі ў формах аднаго і таго ж слова.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**215.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі ў розных формах слоў *гняздо, павуцінне*.

Чыжыкі надавалі шмат увагі *(гняздо)*. Яны вілі яго на самай высокай яліне. Гаспадар прыносіў у дзюбе сухія галінкі, мох, *(павуцінне)*. Чыжыха мацавала пруткі *(павуцінне)*, выкладала *(гняздо)* усярэдзіне пухам. Хутка ў *(гняздо)* з'явіліся яечкі.

Знайдзіце ў тэксце словы, аднакаранёвыя да слова *чыж*. Выдзеліце ў іх корань.

***пена́л***

**216.** Назавіце прадмет на малюнку. Колькі складоў у слове *пенал*? На які склад падае націск? Якая літара пішацца ў першым складзе перад націскам?



У Андрэйкі ёсць прыгожы ... .
У ... ляжаць ручкі, алоўкі, фламастары.
Хлопчык ніколі не ходзіць у школу без ... .
Сябры захапляюцца незвычайным ... Андрэйкі.

Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у патрэбнай форме. Выдзеліце канчаткі ў розных формах гэтага слова. У якой форме слова вы не ўбачылі канчатка?



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Завяжы вузялок!**

У некаторых формах слова канчатак можа быць не выражаны гукамі (літарамі). Такі канчатак называецца **нулявым** і выдзяляецца знакам ☐: *пенал*☐, *аловак*☐, *пэндзаль*☐.

**217.** Прачытайце скорагаворку. Што пераблытаў аўтар?

На бярозе рак,
у рачулцы грак,
пад канапай крот,
а ў норцы кот.

*Н. Галіноўская.*

Запішыце сказ, расставіўшы на месцы словы. Выдзеліце канчаткі ў словах скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам.

**218.** Прачытайце. Вызначце, што аб'ядноўвае словы ў кожным радзе. Дапоўніце кожны рад патрэбнымі словамі. Карыстайцеся даведкай.

1) Пенал, аловак, сшытак, ..., ... .
2) Кнігай, кнігу, кнізе, ..., ... .
3) Клас, класны, аднакласнік, ..., ... .

Словы для даведкі: *аднакласніца, ручка, кніга, пэндзаль, кнігі, пазакласны.*



Спампавана з сайта www.aversev.by

**219.** Прачытайце верш. Як ён падказвае паслядоўнасць колераў вясёлкі?

## Колеры вясёлкі

Каб вясёлку скласці з літар,
выбірае словы Наста:
**ч**араўніца,
**а**рка,
**ж**ыта,
**з**амак,
**б**эз,
**с**іроп,
**ф**ламастар.




*А. Зэкаў.*

Выпішыце выдзеленыя словы ў два слупкі: у адзін — словы з нулявым канчаткам, у другі — усе астатнія. Выдзеліце канчаткі ў словах.



Запомніце верш. Прыдумайце свой набор слоў з нулявым канчаткам, якія падкажуць паслядоўнасць колераў вясёлкі (напрыклад: *чыж, арол, жаўрук, зімародак, бусел, страус, фазан*).



**220.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі слоў, якія стаялі ў дужках.

## Шпакоўні

У майстэрні прыемна пахла *(свежае)* пілавіннем. Дзед з *(Васілёк)* майстравалі шпакоўні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Да *(вечар)* яны зрабілі тры домікі для птушак. Васілёк павесіў *(шпакоўня)* у садзе на грушах.

Аднойчы *(сонечная)* раніцай у *(сад)* прыляцелі шпакі. Яны *(аблюбавала)* домікі на грушах *(Паводле Я. Галубовіча)*.

***пілаві́нне*** — *апілкі*
***аблюбава́ць*** — *выбраць сабе што-небудзь па густу, па жаданні*

Знайдзіце аднакаранёвыя словы ў тэксце. Выдзеліце ў іх корань. Знайдзіце ў апавяданні формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

**221.** Прачытайце. У якіх радках запісаны формы аднаго і таго ж слова? Якія словы запісаны ў астатніх радках?

1) сяброўства, сяброўка, сяброўскі, пасябраваць;
2) сябры, сяброў, сябрам, сябрамі;
3) маляванне, намаляваць, малюнак, размалёўка;
4) малюнак, малюнкі, малюнкамі, малюнкаў.

Спішыце адну групу аднакаранёвых слоў на выбар. Выдзеліце ў іх корань.

Вусна падбярыце сінонімы да слова *сябры*.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**222.** Прачытайце прыказкі. Пра каго так гавораць?

Іх і вада не размы**е**. Іх і вадою не разаль**еш**.

Спішыце. Дакажыце, што ў словах выдзелены канчаткі.

Формы якога слова сустрэліся ў прыказках? Абазначце ў іх канчаткі.

**223.** Прачытайце верш. Хто можа сябраваць? Як сябруюць паміж сабой дрэвы?

### Сяброўства

Жывуць у сяброўстве дрэвы —
дуб з клёнам, бяроза з сасной.
Яны размаўляюць нібыта
брат з братам, сястра з сястрой.

Як бацька, іх дуб прыкрывае,
калі залютуюць вятры.
Такая апека бывае,
калі ў добрай згодзе сябры.

*П. Пранузa.*

Выпішыце з верша формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

Знайдзіце ў вершы аднакаранёвыя словы. Выпішыце іх, абазначце корань.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Назавіце словы, правапіс якіх трэба правяраць. Выпішыце іх, вусна падбярыце праверачныя словы. Абазначце ў запісаных словах корань і канчатак.

Рм Прыклад якога незвычайнага сяброўства вы можаце прывесці?

Рм **224.** Разгледзьце малюнак. Які ўрок ідзе ў класе? Якая тэма ўрока? Каго намалявалі хлопчыкі? Які незвычайны малюнак атрымаўся ў дзяўчынкі?




Прачытайце пачатак тэксту.

## Такія розныя сябры

Урок малявання сёння пачаўся незвычайна. Настаўніца прапанавала вучням намаляваць сяброў...

Складзіце план будучага апавядання. Прыдумайце і запішыце свой тэкст па малюнку і прапанаваным пачатку. Карыстайцеся словамі з практыкавання 221.



Спампавана з сайта www.aversev.by



**225.** Прачытайце. Якія словы ў вершы ўжыты ў пераносным значэнні? Што абазначае выраз *сябраваць з алоўкамі*?

## Алоўкі

Каляровыя алоўкі
па **паперы**
**ходзяць** лоўка.
Мы з алоўкамі сябруем
і што **хочам** —
намалюем.

*Н. Сцепусь.*

Спішыце. Назавіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі.

Абазначце корань і канчатак у выдзеленых словах.

Спампавана з сайта www.aversev.by

# Спіс выкарыстанай літаратуры

*Агняцвет, Э.* У свеце дабрыні : зб. вершаў / Э. Агняцвет ; уклад. А. Бычко, С. Богуш. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2013.

Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для навучэнцаў пед. каледжаў і вучылішчаў / склад. : М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. Мінск : Вышэйшая школа, 2003.

Беларуская літаратура : Пазакласнае чытанне / аўт.-уклад. Л. І. Строк. Мінск : Юнипресс, 2009.

*Бічэль-Загнетава, Д. І.* Гараднічанка : вершы / Д. І. Бічэль-Загнетава. Мінск : Юнацтва, 1993.

Буся. 2013. № 2.

Вясёлка. 2007. № 4—6.

Вясёлка. 2008. № 5—6, 9, 12.

Вясёлка. 2009. № 6—9, 11—12.

Вясёлка. 2010. № 1—3, 6, 8—11.

Вясёлка. 2011. № 1—10.

Вясёлка. 2012. № 2, 4.

Вясёлка. 2013. № 3.

Вясёлка. 2014. № 1.

Вясёлка. 2015. № 1—2, 5.

Вясёлка. 2016. № 4—5.

Вяснянка : вершы, апавяданні, казкі беларускіх пісьменнікаў. Мінск : Юнацтва, 1983.

*Галіноўская, Н. В.* Гусіны капялюш : вершы, казкі, загадкі : для дашк. і мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская. Мінск : Юнацтва, 1994.

*Галіноўская, Н. В.* Клубок і калабок / Н. В. Галіноўская. Мінск : Юнацтва, 1999.

*Галубовіч, І. І.* Вавёрчыны кватаранты : апавяданні і казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / І. І. Галубовіч ; маст. Н. А. Чарапанава. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015.

*Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч ; маст. К. Г. Разанкова. Мінск : Пачатковая школа, 2012.

*Галубовіч, Я.* Хто рукавічку згубіў? : апавяданні, казкі : кн. для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Я. Галубовіч. Мінск : Народная асвета, 2012.

*Гардзей, В. К.* Малая дзіцячая Чырвоная кніга / В. К. Гардзей. Мінск : Беларусь, 2008.



Спампавана з сайта www.aversev.by

*Даніленка, М. П.* Як дажджы памірыліся : апавяданні, казкі : кн. для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Даніленка. Мінск : Народная асвета, 2013.

*Зуёнак, В. В.* Бадзірог : Карагод вясёлых прыгод і рыфмай звязаных, і проста расказаных / В. В. Зуёнак. Мінск : Юнацтва, 1995.

*Зуёнак, В.* Рэха : вершы, загадкі, пацешкі : для дашк. і мал. шк. узросту / В. Зуёнак ; маст. У. В. Гладкевіч. Мінск : Мастацкая літаратура, 2003.

*Зэкаў, А. М.* Вожык вёз сараканожак : вершы : для дзяцей мал. шк. узросту / А. М. Зэкаў ; маст. В. Міронцава. Мінск : Звязда, 2014.

*Зэкаў, А.* Кенгуру ці кенгура? : казкі і вершы : для мал. шк. узросту / А. Зэкаў. Мінск : Народная асвета, 2013.

*Зэкаў, А. М.* Не казкі пра Сашку / А. М. Зэкаў ; маст. Г. С. Хінка-Янушкевіч. Мінск : Мастацкая літаратура, 2013.

*Кавалёў, П. Н.* Намеснік бабулі : смяшынкі, замалёўкі / П. Н. Кавалёў. Мінск : Юнацтва, 1992.

*Кажура, В. В.* Азбука ў вершах і малюнках / В. В. Кажура ; маст. А. Я. Саковіч. Мінск : Пачатковая школа, 2014.

*Карызна, У. І.* Лепяць ластаўкі гняздзечкі : вершы, загадкі, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / У. І. Карызна ; маст. Т. Беразенская, Н. Каламейцава. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010.

*Крапіва, К.* Загадкі дзеда Кандрата : для дзяцей мал. шк. узросту / К. Крапіва ; маст. А. В. Александровіч. Мінск : Юнацтва, 2002.

Крынічка : Чытанка : для дашк. і мал. шк. узросту / уклад. Р. М. Міронава ; маст. Т. П. Беразенская. Мінск : Мастацкая літаратура, 2009.

*Мазго, У.* Прыгоды марахода / У. Мазго. Мінск : Юнацтва, 2002.

*Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка. Мінск : Мастацкая літаратура, 2013.

*Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : вершы, загадкі, казкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст. А. І. Гармаза. Мінск : Юнацтва, 1995.

*Муравейка, І. А.* Вадзіца з крыніцы : вершы, загадкі : для мал. шк. узросту / І. А. Муравейка ; маст. С. Л. Рыжыкава. Мінск : Мастацкая літаратура, 2006.

*Муравейка, І.* Куды ні пойдзеш — цуды знойдзеш : вершы, апавяданні, казкі, загадкі : для мал. шк. узросту / І. Муравейка ; маст. А. П. Пратасеня. Мінск : Юнацтва, 2001.



Спампавана з сайта www.aversev.by

*Муравейка, І. А.* Растуць дзеці / І. А. Муравейка. Мінск : Мастацкая літаратура, 2011.

*Мушынская, Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апавяданні, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Т. М. Мушынская ; маст. Г. С. Хінка-Янушкевіч. Мінск : Литература и Искусство, 2008.

*Пазнякоў, М.* Ехаў поўны воз дзівос / М. Пазнякоў. Мінск : Юнацтва, 1994.

*Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў ; маст. С. Волкаў. Мінск : Литература и Искусство, 2009.

*Паўлаў, У. А.* Колькі гусей убачыў Яўсей? : вершы, загадкі, казкі / У. А. Паўлаў. Мінск : Юнацтва, 1994.

Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008.

*Рунец, П. М.* Алёшка-верхалаз / П. М. Рунец ; мал. В. Кандара. Мінск : Беларусь, 1963.

*Рунец, П. М.* Добрая душа : апавяданні : для мал. шк. узросту / П. М. Рунец ; маст. Б. Забораў. Мінск : Мастацкая літаратура, 1977.

*Солахаў, А. В.* Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. Мінск : Зорны Верасок, 2012.

Сучасная беларуская мова / Л. І. Бурак, В. П. Красней, У. М. Лазоўскі. Мінск : Універсітэцкае, 1989.

*Хомчанка, В.* Чырвоныя ягады : апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Хомчанка ; уклад. Н. С. Мінкевіч ; маст. К. С. Ракіцкі, А. Г. Званароў. Мінск : Юнацтва, 1999.

*Чарняўскі, М.* Хто пакрыўдзіў кракадзіла? : вершы, казкі, пацешкі, скорагаворкі, загадкі, лічылкі : для мал. шк. узросту / М. Чарняўскі ; маст. С. А. Волкаў. Мінск : Юнацтва, 1999.

*Шах, С. М.* Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапам. для лагапедаў / С. М. Шах. Мінск : Народная асвета, 1998.

*Шахрай, І.* Кучаравы пэндзлік : казка / І. Шахрай. Мінск : Мастацкая літаратура, 2012.

*Ягоўдзік, У.* Год-карагод : апавяданні і мініяцюры : для мал. і сярэд. шк. узросту / У. Ягоўдзік ; фота С. Чарапіцы. Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2013.

Делаем вместе [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://delaemvmeste.by/wp-content/gallery/vitaliy-tsvirko/vecher-1987.jpg



Спампавана з сайта www.aversev.by

# Змест

Паўтарэнне .................................... 3

## ТЭКСТ

Прыметы тэксту .................................... 19
План тэксту .................................... 29

## СКАЗ

Прыметы сказа .................................... 40
Тыпы сказаў .................................... 43
Апавядальныя сказы .................................... 46
Пытальныя сказы .................................... 49
Пабуджальныя сказы .................................... 55
Клічныя сказы .................................... 61
Галоўныя і даданыя члены сказа .................................... 68
Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа 68
Даданыя члены сказа .................................... 74

## ЗНАЧЭННЕ СЛОВА

Адназначныя і мнагазначныя словы .................................... 88
Прамое і пераноснае значэнне слова .................................... 91
Сінонімы .................................... 95
Антонімы .................................... 98
Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні .................................... 102

## СКЛАД СЛОВА

Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова .................................... 109
Формы слова. Канчатак .................................... 127

Спіс выкарыстанай літаратуры .................................... 139



Спампавана з сайта www.aversev.by

**Свірыдзенка, В. І.**

С24 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — Ч. 1. — 144 с. : іл.

ISBN 978-985-559-882-5

**УДК 811.161.3(075.2=161.3=161.1)**
**ББК 81.2Беи-922**

Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 1

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *І. М. Лапанец*
Мастакі *Д. М. Матарыкін, Н. А. Хромава,*
*Л. А. Мурашка, А. М. Брыкет*
Вокладка *Ю. М. Галавейка*
Мастацкі рэдактар *А. П. Пратасеня*
Камп’ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *К. В. Шобік, Д. Р. Лосік*

Падпісана ў друк 29.05.2017. Фармат 70×90/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 4,41 + 0,47 форз. Тыраж 140 500 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Спампавана з сайта www.aversev.by

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Спампавана з сайта www.aversev.by